Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар БДУКМ
______________Ю. П. Бондар
«____» ____________ 2015 г.
Рэгістрацыйны № ВД-___/баз.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай
спадчыны (па напрамках)*

Мінск
БДУКМ
2015

**СКЛАДАЛЬНІК**

*М. А. Бяспалая,* загадчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», доктар гістарычных навук, прафесар

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*Ю. М. Бохан,* загадчык кафедры эканамічнай гісторыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт», доктар гістарычных навук, дацэнт;

*У. Я. Казлякоў,* прафесар кафедры гісторыі Беларусі і палітalогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт», доктар гістарычных навук, прафесар

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 7 ад 27.02.2014 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 2 ад 13.11.2014 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: М. А. Бяспалая

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Для студэнтаў спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках) вучэбная дысцыпліна «Гісторыя Беларусі» з’яўляецца асноўнай. Толькі дастаткова высокі ўзровень ведаў па айчыннай гісторыі дазваляе студэнтам аптымальна засвойваць спецыяльныя дысцыпліны. Па гэтай прычыне апраўданым з’яўляецца выкладанне гісторыі Беларусі ў значным аб’ёме, што дазваляе спалучаць розныя падыходы да разбіўкі курса па семестрах: цывілізацыйны, фармацыйны і нават дзяржаўніцкі, грунтоўна вывучаць праблемныя моманты гісторыі Беларусі, пытанні развіцця культуры, выяўляць агульнае і асаблівае еўрапейскага і айчыннага гістарычнага працэсу.

Сувязь вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя Беларусі» з іншымі дысцыплінамі сацыяльна-гуманітарнага цыкла і спецыяльнымі дысцыплінамі самая непасрэдная. Яна праслежваецца падчас усяго працэсу навучання – ад першага да апошняга курса, ад лекцый, семінарскіх заняткаў – да залікаў і экзаменаў. Адной з вучэбна-метадычных задач пры выкладанні айчыннай гісторыі з’яўляецца грунтоўнае замацаванне ведаў па гісторыі Беларусі і развіццё ў студэнтаў здольнасці да сінхроннага ўяўлення аб гістарычным працэсе.

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны – фарміраванне ў студэнтаў грунтоўных ведаў па гісторыі роднай краіны, а на гэтай падставе – пачуцця патрыятызму, актыўнай грамадзянскай і прафесійнай пазіцыі.

*Задачамі* курса з’яўляюцца:

– выяўленне эканамічнай, палітычнай, сацыяльнай і культурнай заканамернасцей айчыннага гістарычнага працэсу;

– адлюстраванне асаблівасці шляхоў узнікнення, станаўлення паступальнага, эканамічнага, палітычнага, сацыяльнага, культурнага развіцця на тэрыторыі Беларусі на розных гістарычных этапах;

– навуковая характарыстыка фарміравання беларускага этнасу, народнасці, нацыі, станаўлення беларускай дзяржаўнасці і суверэнітэту;

– раскрыццё своеасаблівасці развіцця беларускай культуры і вызначэнне прычын гэтай з’явы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

– галоўныя заканамернасці і асаблівасці айчыннага гістарычнага працэсу;

– важнейшыя праблемныя пытанні гісторыі Беларусі;

– вызначальныя гістарычныя падзеі і іх асноўных удзельнікаў;

– значныя дасягненні беларускага народа ў развіцці матэрыяльнай і духоўнай культуры і іх захаванне ў якасці гісторыка-культурнай спадчыны;

*умець:*

– вызначаць галоўныя этапы гістарычнай эвалюцыі і яе храналогію;

– дыскутаваць па праблемных пытаннях гісторыі Беларусі ў вуснай і пісьмовай форме;

– спалучаць атрыманыя веды з практыкай музейнай, краязнаўчай і турыстычнай дзейнасці;

– фармуляваць галоўныя аргументы, весці пастаянны пошук фактаў, якія больш выразна і доказна раскрывалі б гісторыю Беларусі, у тым ліку і яе рэгіёнаў;

*валодаць:*

– навыкамі сістэматызацыі атрыманых ведаў;

– уменнем генерыраваць новыя ідэі і ўкараняць іх у практычную дзейнасць;

– творчым падыходам да вывучэння, інтэрпрэтацыі і трансляцыі гісторыка-культурнай спадчыны беларускага народа.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Гісторыя Беларусі» ўсяго адведзена 416 гадзін, з якіх 190 гадзін – аўдыторныя заняткі (110 гадзін – лекцыі, 80 гадзін – семінары). Рэкамендаваныя формы кантролю – залік і экзамены.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | лекц. | сем. |
| **Раздзел I. Беларусь і цывілізацыйныя працэсы Старажытнасці і Сярэднявечча** | | | |
| *Тэма 1.* Задачы і змест дысцыпліны. Гістарыяграфія і крыніцы. Дыскусійныя пытанні гісторыі Беларусі | 2 | 2 | |
| *Тэма 2.* Эвалюцыя першабытнага грамадства на тэрыторыі Беларусі на працягу каменнага, бронзавага і жалезнага вякоў | 2 | 2 | |
| *Тэма 3.* Сацыякультурныя і этнічныя працэсы ў пачатку ранняга Сярэднявечча (V–IX стст.) | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 4.* Палітычнае развіццё Полацкай зямлі ў IX–XI стст. | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 5.* Тураўская зямля ў X – пачатку XIII ст. Феадальная раздробленасць Полацкай і Тураўскай зямель | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 6.* Сацыяльна-эканамічнае развіццё Полацкай і Тураўскай зямель | 4 | 4 | |
| *Тэма 7.* Духоўнае жыццё і матэрыяльная культура Полацкай і Тураўскай зямель у IX – пачатку XIII ст. | 2 | | 2 |
| *Тэма 8.* Гістарычная заканамернасць утварэння сярэдневяковай дзяржавы на беларускіх землях | 2 | 2 | |
| *Тэма 9.* Працэс утварэння Вялікага Княства Літоўскага | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 10.* Фарміраванне тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага. Асноўныя кірункі знешняй і ўнутранай палітыкі ў XIV ст. | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 11.* Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае ў перыяд праўлення вялікага князя Вітаўта (1392–1430) | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 12.* Унутрыпалітычнае становішча Вялікага Княства Літоўскага ў XV ст. | 2 | | 2 |
| **Раздзел II. Беларусь у Новы час 2.1 Беларусь у складзе Рэчы Паспалітай** | | | |
| *Тэма 13.* Знешняя палітыка Вялікага Княства Літоўскага ў XV – пачатку XVI ст. | 2 | 2 | |
| *Тэма 14.* Фарміраванне тэрытарыяльна-адміністрацыйнай структуры і стратыфікацыя пануючага класа Вялікага Княства Літоўскага | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 15.* Станаўленне феадальнай сістэмы ў XV–XVI стст. | 4 | 2 | 2 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | |
|---|---|---|---|
| *Тэма 16.* Гарады Беларусі ў XV–XVI стст. | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 17.* Знешне- і ўнутрыпалітычнае становішча Вялікага Княства Літоўскага ў другой палове XVI ст. | 4 | 4 | |
| *Тэма 18.* Рэлігійная сітуацыя ў Вялікім Княстве Літоўскім у XIV–XVI стст. | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 19.* Фарміраванне беларускай народнасці | 2 | | 2 |
| *Тэма 20.* Духоўная і матэрыяльная культура Беларусі ў перыяд Адраджэння (XIV–XVI стст.) | 2 | | 2 |
| *Тэма 21.* Становішча Вялікага Княства Літоўскага ў першай палове XVII ст. | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 22.* Казацка-сялянскія паўстанні на тэрыторыі Беларусі ў сярэдзіне XVII ст. Беларусь падчас вайны Расіі і Рэчы Паспалітай (1654–1667) | 4 | 4 | |
| *Тэма 23.* Унутры- і знешнепалітычнае становішча Вялікага Княства Літоўскага ў апошняй трэці XVII–XVIII ст. | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 24.* Эканамічнае развіццё Вялікага Княства Літоўскага ў XVIII ст. | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 25.* Ідэалагічная праграма пануючага саслоўя Вялікага Княства Літоўскага | 2 | 2 | |
| *Тэма 26.* Сістэмны крызіс Рэчы Паспалітай і спробы захавання дзяржавы | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 27.* Духоўная і матэрыяльная культура Беларусі ў XVII–XVIII стст. | 2 | | 2 |
| **2.2 Развіццё Беларусі ў складзе Расійскай імперыі** | | | |
| *Тэма 28.* Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі (апошняя чвэрць XVIII – пачатак XIX ст.) | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 29.* Беларусь у вайне 1812 г. | 2 | 2 | |
| *Тэма 30.* Сацыяльна-эканамічнае становішча беларускіх губерняў у першай палове XIX ст. | 4 | 4 | |
| *Тэма 31.* Грамадска-палітычны рух у першай палове XIX ст. | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 32.*Культура Беларусі ў першай палове XIX ст. | 2 | | 2 |
| *Тэма 33.* Адмена прыгоннага ладу. Рэформа 1861 г. | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 34.* Паўстанне 1863–1864 гг. у Беларусі і яго наступствы | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 35.* Эканамічнае развіццё Беларусі ў другой палове XIX ст. Рэформы 1860–1870-х гг. | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 36.* Грамадска-палітычнае жыццё беларускіх губерняў у другой палове XIX ст. | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 37.* Эканамічнае і грамадска-палітычнае развіццё Беларусі ў пачатку XX ст. | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 38.* Працэс фарміравання беларускай нацыі. Беларускі нацыянальны рух | 4 | 2 | 2 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | |
|---|---|---|---|
| *Тэма 39.* Рэвалюцыя 1905–1907 гг. і яе ўплыў на развіццё беларускай культуры | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 40.* Развіццё культуры Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. | 2 | 2 | |
| *Тэма 41.* Беларусь у гады Першай сусветнай вайны | 2 | 2 | |
| *Тэма 42.* Лютаўская рэвалюцыя і ўплыў яе наступстваў на ўнутрыпалітычнае развіццё Беларусі ў лютым – кастрычніку 1917 г. | 2 | | 2 |
| **Раздзел III. Сацыяльна-эканамічныя і сацыяльна-палітычныя працэсы Найноўшага часу і Беларусь**<br>**3.1 БССР у перыяд фарміравання савецкай мадэлі развіцця** | | | |
| *Тэма 43.* Кастрычніцкія падзеі ў Беларусі. Першыя пераўтварэнні савецкай улады | 2 | 2 | |
| *Тэма 44.* Беларусь падчас нямецкай акупацыі 1918 г. Абвяшчэнне БНР | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 45.* Працэс утварэння БССР. ЛітБел | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 46.* Беларусь у перыяд савецка-польскай вайны (1919–1920) | 2 | 2 | |
| *Тэма 47.* Сацыяльна-палітычнае і эканамічнае становішча БССР у перыяд новай эканамічнай палітыкі (1921–1928) | 2 | 2 | |
| *Тэма 48.* Грамадскае і культурнае жыццё БССР у 1920-я гг. | 2 | | 2 |
| *Тэма 49.* Індустрыялізацыя і калектывізацыя ў БССР | 4 | 4 | |
| *Тэма 50.* Грамадска-палітычная сітуацыя і культурнае жыццё ў БССР у 1930-я гг. | 2 | | 2 |
| *Тэма 51.* Сацыяльна-эканамічны стан Заходняй Беларусі | 2 | 2 | |
| *Тэма 52.* Грамадска-палітычнае жыццё і нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 53.* Першы перыяд Другой сусветнай вайны. Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР | 2 | 2 | |
| *Тэма 54.* БССР у гады Вялікай Айчыннай вайны (1941–1944) | 4 | | 4 |
| *Тэма 55.* БССР у перыяд аднаўлення 1945–1950 гг. | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 56.* БССР у 1950–1960-я гг. | 2 | 2 | |
| *Тэма 57.* БССР у 1970–1980-я гг. | 2 | 2 | |
| **3.2 Рэспубліка Беларусь у сучасным геапалітычным працэсе** | | | |
| *Тэма 58.* Рэспубліка Беларусь: этапы станаўлення | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 59.* Рэспубліка Беларусь: эканамічнае і сацыяльна-культурнае развіццё. Знешняя палітыка | 2 | 2 | |
| *Тэма 60.* Новыя тэндэнцыі і формы арганізацыі культурнага жыцця краіны на сучасным этапе | 2 | | 2 |
| **Разам…** | **190** | **110** | **80** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Раздзел I. Беларусь і цывілізацыйныя працэсы Старажытнасці і Сярэднявечча

### *Тэма 1. Задачы і змест дысцыпліны. Гістарыяграфія і крыніцы. Дыскусійныя пытанні гісторыі Беларусі*

Змест і структура дысцыпліны. Суадносіны з іншымі гістарычнымі і са спецыяльнымі дысцыплінамі. Вучэбна-метадычныя задачы выкладання гісторыі Беларусі.

Крыніцазнаўчая база айчыннай гісторыі. Працэс яе навуковага даследавання. Агульная характарыстыка гістарыяграфіі. Нацыянальныя гістарычныя школы. Гістарыяграфія гісторыі музейнай справы як складаючай часткі гісторыі культуры Беларусі. Дыскусійныя пытанні айчыннай гісторыі. Перыядызацыя гісторыі Беларусі.

### *Тэма 2. Эвалюцыя першабытнага грамадства на тэрыторыі Беларусі на працягу каменнага, бронзавага і жалезнага вякоў*

Навуковыя падыходы да перыядызацыі першабытнага грамадства (археалагічны, сацыялагічны, геалагічны і інш.). Паняцці «археалагічная культура», «абшчына», «род». Першае пранікненне чалавека на тэрыторыю Беларусі. Матэрыяльная культура эпохі палеаліту і мезаліту. Стаянкі гэтых перыядаў. Дасягненні матэрыяльнай культуры эпохі неаліту. Неалітычная рэвалюцыя і яе наступствы. Даіндаеўрапейскі перыяд гісторыі Беларусі. Плямёны розных археалагічных культур. Этнічная карта насельніцтва ў канцы каменнага веку. Угра-фіны.

Эвалюцыя матэрыяльнай культуры, сацыяльных адносін, палітычнай структуры насельніцтва Беларусі на працягу бронзавага і жалезнага вякоў. Перамены ў гаспадарчых занятках, эвалюцыя родавай абшчыны, сямейных адносін і грамадскага ладу. Узнікненне прыватнай уласнасці і маёмаснай няроўнасці. Духоўная культура першабытнага грамадства. Першыя вядомыя перасяленні народаў, іх прычыны. Індаеўрапейцы – новыя насельнікі Еўропы. Пачатак індаеўрапейскага перыяду ў этнічнай гісторыі Беларусі. Балты і іх рассяленне на тэрыторыі Беларусі. Балцкія плямёны ў пачатку рассялення славян (V–VII стст. н.э.). Тры групы балцкіх плямён.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

### *Тэма 3. Сацыякультурныя і этнічныя працэсы ў пачатку ранняга Сярэднявечча (V–IX стст.)*

Летапісныя крыніцы і археалагічныя даныя аб паходжанні і рассяленні славян. Славянскія плямёны, якія рассяліліся на тэрыторыі Беларусі. Вераванні ўсходніх славян, іх індаеўрапейскія карані.

Этапы фарміравання этнакультурнага адзінства. Асіміляцыйныя працэсы паміж славянамі і балтамі, іх праявы ў матэрыяльнай культуры. Банцараўская матэрыяльная культура, яе паходжанне і характэрныя рысы. Дадзеныя этнаграфіі, лінгвістыкі, тапанімікі і пытанне этнагенезу беларусаў.

Сутнасць тэорыі субстратнага паходжання беларусаў, яе крытыка. Розныя канцэпцыі па пытанні фарміравання беларускага этнасу: крывіцкая, балцкая, старажытнаруская, польская, велікаруская і інш.

### *Тэма 4. Палітычнае развіццё Полацкай зямлі ў IX–XI стст.*

Праблемныя пытанні працэсу ўзнікнення раннесярэдневяковай дзяржавы ва ўсходніх славян: уплыў знешняга (варажскага) фактару, тэрміны «Русь», «Руская зямля», «Кіеўская Русь». Адносіны паміж Полацкам, Ноўгарадам і Кіевам і інш.

Заканамернасць фарміравання раннесярэдневяковай дзяржавы ў форме княства на тэрыторыі рассялення палачан: наяўнасць тэрыторыі, улады князя, грамадскага падзелу працы, стратыфікацыі грамадства, развіццё ўнутранага і знешняга гандлю і інш.

Асноўныя падзеі, звязаныя з Полацкам у 862, 865, 978 (980) гг. Іх значэнне, наступствы і навуковая ацэнка. Ініцыятыва полацкага веча па аднаўленні дынастыі Рагвалодавічаў. Князь Ізяслаў. Дзейнасць князя Брачыслава.

Асоба полацкага князя Усяслава Брачыслававіча (Чарадзея). Асноўныя кірункі яго дзейнасці і палітычныя прыярытэты. Бітва на Нямізе, яе прычыны, наступствы, ацэнка сучаснікамі. Сацыякультурнае развіццё пры Усяславе Чарадзеі. З’яўленне ўдзелаў у Полацкай зямлі на падставе родавага права. Абвастрэнне адносін з Кіевам. Прычыны і наступствы гэтай з’явы. Падзеі 1117 і 1119 гг., 1129 і 1132 гг.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Тэма 5. Тураўская зямля ў X – пачатку XIII ст. Феадальная раздробленасць Полацкай і Тураўскай зямель*

Рассяленне дрыгавічоў, іх племянное княжанне. Гандлёвыя шляхі. Суадносіны з Кіевам. Тураўскі князь Святаполк і яго палітыка. Заснаванне тураўскай дынастыі Ізяславічаў. Міжды-настычная барацьба за Тураў у 1113–1158 гг. паміж Манама-хавічамі і Вольгавічамі. Юрый Яраславіч і яго барацьба за не-залежнасць ад Кіева. Тураўскае княства ў канцы XII – пачатку XIII ст. Нападзенне мангола-татар, яго палітычныя і эканаміч-ныя наступствы.

Прычыны, заканамернасць і праявы працэсу раздробленасці ў Полацкай і Тураўскай землях. Удзелы ў Полацкай зямлі. Барацьба паміж асобнымі галінамі роду Усяславічаў, Глеба-вічамі, Барысавічамі, Васільковічамі. Полацкая зямля ў канцы XII – першай палове XIII ст. Полацкі князь Уладзімір. Адносі-ны са Смаленскам, Рыгай. Пачатак барацьбы з крыжакамі.

## *Тэма 6. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Полацкай і Тураўскай зямель*

Навуковыя падыходы да вызначэння сацыяльна-эканаміч-нага і грамадскага ладу ў перыяд рассялення славян (V–VIII стст.). Пераход ад родавай (вялікасямейнай) абшчыны да суседскай (тэрытарыяльнай) у IX–X стст. Роля і паўнамоцтвы абшчыны. Пачатак сацыяльнай дыферэнцыяцыі.

Фарміраванне феадальных адносін, вызначэнне галоўных прыкмет феадалізму. Сялянства і яго групы, фарміраванне феадальных вярхоў грамадства. Агратэхнічны стан і прыёмы земляробства ў IX–XIII стст.

Аддзяленне рамяства ад земляробства і значэнне гэтага працэсу. Узнікненне гарадоў, пашырэнне гарадской тэрыторыі, стварэнне сістэмы збору даніны – пагостаў. Гарады Беларусі IX–XIII стст. Рамяство, яго віды і вузкая спецыялізацыя. Развіццё ўнутранага гандлю праз рознічны гандаль, кірмашы, базары, таргі. Роля царквы ў пашырэнні гандлю. Знешні гандаль. Шлях «з вараг у грэкі». Гандаль са Скандынавіяй. Грашовае абарачэнне. Зараджэнне міжнароднага камерцыйнага права.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 7. Духоўнае жыццё і матэрыяльная культура Полацкай і Тураўскай зямель у IX – пачатку XIII ст.*

Заканамернасць прыняцця хрысціянства ўсходнімі славянамі. Ранняе пранікненне хрысціянства ў іх асяроддзе. Хрышчэнне Кіеўскай Русі ў 988 г. Значэнне гэтага акта. Асаблівасці хрышчэння Полацкай зямлі. Паступовае распаўсюджванне хрысціянства, яго суіснаванне побач з язычніцтвам. Узнікненне епархій. Новыя з'явы ў паўсядзённым жыцці, прыўнесеныя хрысціянствам. Распаўсюджванне пісьмовасці і адукацыі, значэнне гэтага працэсу. Кніжная культура.

Жыццё і духоўны подзвіг Ефрасінні Полацкай. Яе культурна-асветніцкая і мецэнацкая дзейнасць. Духоўна-літаратурная спадчына Кірылы Тураўскага, К. Смаляціча і А. Смаленскага.

Уплыў хрысціянства на матэрыяльную культуру беларускіх зямель: архітэктура, развіццё мясцовых яе асаблівасцей, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

### *Тэма 8. Гістарычная заканамернасць утварэння сярэдневяковай дзяржавы на беларускіх землях*

Знешне- і ўнутрыпалітычныя ўмовы развіцця Полацкага і Тураўскага княстваў у першай палове XIII ст. Навагародская зямля ў першай палове XIII ст. Гарады Панямоння. Эканамічнае і палітычнае становішча балцкіх плямён. Рассяленне балтаў. Тэрмін «гістарычная (старажытная, летапісная) Літва». Канцэпцыі месцазнаходжання. Аб'ектыўная заканамернасць утварэння новай сярэдневяковай дзяржавы на беларускіх землях. Храналогія гэтага працэсу.

### *Тэма 9. Працэс утварэння Вялікага Княства Літоўскага*

Адносіны Новагародскай зямлі і Галіцка-Валынскага княства. Асоба Міндоўга – уладара часткі летапіснай Літвы на пасаду князя. Падпарадкаванне ім тэрыторыі астатняй Літвы і абвастрэнне адносін з Галіцка-Валынскім княствам. Дыпламатычныя захады Міндоўга – прыняцце каталіцтва і каранацыя. Асоба Войшалка і вынікі яго перамоў з Данілам Галіцкім. Барацьба Войшалка за ўладу ў Новагародку. Пашырэнне тэрыторыі княства за кошт балцкіх зямель. Вынікі дзейнасці Міндоўга і Войшалка. Значэнне славяна-балцкага саюза. Паходжанне і сутнасць назвы «Вялікае Княства Літоўскае».

Умацаванне становішча Вялікага Княства Літоўскага пры князі Трайдзені (1270–1282) і князі Віцені (1293–1314).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Тэма 10. Фарміраванне тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага. Асноўныя кірункі знешняй і ўнутранай палітыкі ў XIV ст.*

Прыход да ўлады вялікага князя Гедыміна, яго асоба. Умацаванне ўнутранага стану дзяржавы: працяг барацьбы з жамойтамі, падтрымка інтарэсаў Полацка. Пашырэнне тэрыторыі княства. Кірунак на ўзрастанне прэстыжу дзяржавы праз дынастычную палітыку. Адносіны з Вялікім Ноўгарадам і Псковам, прычыны абвастрэння адносін з Масквой, непаслядоўнасць саюза з Польшчай. Барацьба з крыжацкай пагрозай. Давыд Гарадзенскі. Змест унутранай палітыкі вялікага князя. Значэнне пераносу сталіцы. Падтрымка эканамічнага развіцця. Рэлігійнае пытанне.

Праблема з пераемнікам вярхоўнай улады пасля смерці Гедыміна. Падзеі 1345 г. Падзел улады ў ВКЛ паміж братамі–князем Альгердам і князем Кейстутам. Прадаўжэнне знешняй палітыкі, вызначанай пры Гедыміне: змаганне з крыжакамі, адносіны з Масквой. Пашырэнне тэрыторыі ВКЛ. Бітва на Сіняй вадзе (1362).

Унутрыпалітычныя працэсы ў Вялікім Княстве Літоўскім у 1377–1392 гг. Прынцып перадачы ўлады вялікім князем Альгердам. Асоба Ягайлы, своеасаблівасць яго пазіцыі. Адносіны з крыжакамі, татарамі. Пазіцыя полацкага князя Андрэя і вялікага князя Кейстута і трокскай (жамойцкай) баярскай групоўкі. Перамога Ягайлы. Барацьба Вітаўта за ўладу ў ВКЛ.

Шлюб Ягайлы і Ядвігі, яго наступствы. Крэўская унія, прывілей 1387 г. і яго значэнне. Прадаўжэнне барацьбы Вітаўта за пасаду вялікага князя. Востраўскае пагадненне 1392 г.

## *Тэма 11. Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае ў перыяд праўлення вялікага князя Вітаўта (1392–1430)*

Заканамернасць працэсу цэнтралізацыі дзяржаўнай улады. Асоба вялікага князя Вітаўта. Яго змаганне за міжнародны прэстыж дзяржавы. Ліквідацыя ўдзельных княстваў. Аўтаномныя правы Полацка, Віцебска, жамойтаў. Стварэнне новай сістэмы кіравання (ваяводствы, намеснікі).

Эканамічнае развіццё Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Агратэхнічны стан сельскай гаспадаркі. Адміністрацыйная і сацыяльная структура вёскі. Сялянскія павін-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

насці. Фарміраванне новай адзінкі абкладання павіннасцямі – «служба» і яе значэнне. З'яўленне вотчын. Грашовае абарачэнне.

Перамены ў вайсковай справе. Асноўныя кірункі знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага. Бітва на р. Ворскла (1399), яе вынікі і наступствы. Змест Віленска-Радомскай уніі (1401). Адносіны з ордэнскімі дзяржавамі. Падрыхтоўка да рашаючай бітвы з Тэўтонскім ордэнам. Вялікая вайна (1409–1411). Грунвальдская бітва (1410) і яе наступствы. Гарадзельская унія 1413 г., яе змест і значэнне. Спроба каранацыі Вітаўта.

### *Тэма 12. Унутрыпалітычнае становішча Вялікага Княства Літоўскага ў XV ст.*

Асаблівасці перадачы вышэйшай улады ў ВКЛ у XIV–XV стст. Вялікі князь Свідрыгайла і яго дзяржаўная палітыка. Умяшальніцтва Ягайлы ва ўнутраныя справы ВКЛ. Прывілей 1432 г. Жыгімонт Кейстутавіч. Прывілей 1434 г. Вялікае Княства Рускае і Вялікае Княства Літоўскае. Грамадзянская вайна, яе заканчэнне. Палітыка Жыгімонта і апазіцыйныя настроі сярод вярхоў грамадства.

Удзел вярхоў правячага класа ВКЛ у выбары вялікага князя. Казімір Ягелончык, яго праўленне. Ян Гаштольд. Міхаіл Жыгімонтавіч. Пазіцыя польскага боку. Прывілей 1447 г., прычыны яго выдання і змест.

Працэс прыняцця вялікім князем Казімірам польскай кароны. Пазіцыя магнатаў ВКЛ. Каранацыя Казіміра, яго асабовыя якасці. Спрэчныя пытанні паміж Вялікім княствам і Каронай. Непаслядоўнасць пазіцыі Казіміра. Яго адносіны да перадачы ўлады ў Вялікім княстве. Судзебнік 1468 г.

Імкненне магнатаў ВКЛ спешна каранаваць Аляксандра. Асоба вялікага князя. Прывілей 1492 г. Абранне Аляксандра польскім каралём. Падпісанне ў кастрычніку 1501 г. так званага Мельніцкага акта. Яго змест і магчымыя наступствы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел II. Беларусь у Новы час
## 2.1 Беларусь у складзе Рэчы Паспалітай

### *Тэма 13. Знешняя палітыка Вялікага Княства Літоўскага ў XV – пачатку XVI ст.*

Асноўныя мэты знешняй палітыкі ВКЛ у XV ст. Дзяржаўная мяжа. Ідэалагічныя прычыны паступовага абвастрэння адносін з Вялікім Княствам Маскоўскім. «Вялікі акт падзелу» Русі паміж Масквой і Вільняй 1449 г. Пазіцыя вялікага князя Казіміра. Палітыка вялікага маскоўскага князя Івана III. Эміграцыя як адлюстраванне незадаволенасці вярхоў грамадства. Мяцеж М. Глінскага, унутраныя прычыны і знешнепалітычныя наступствы.

Пачатак ваеннага супрацьстаяння паміж ВКЛ і ВКМ у 1494 г. Дынастычны шлюб вялікага князя літоўскага Аляксандра і Алены – дачкі вялікага маскоўскага князя. Вайна 1500 г., бітва каля Дарагабужа. Ваенныя дзеянні 1506–1508 гг. Вайна 1512–1522 гг. з Вялікім Княствам Маскоўскім, бітва пад Оршай (1514). Вайна 1534–1537 гг. Вынікі войнаў з Вялікім Княствам Маскоўскім.

Адносіны з крымскімі татарамі. Нарада 1449 г. Татарскія набегі на тэрыторыю ВКЛ у XV ст. Бітва пад Клецкам 5 жніўня 1506 г., яе вынікі. Набегі татар у XVI ст.

### *Тэма 14. Фарміраванне тэрытарыяльна-адміністрацыйнай структуры і стратыфікацыя пануючага класа Вялікага Княства Літоўскага*

Унутраная палітыка апошніх Ягелонаў: Жыгімонта I Старога (1506–1548) і Жыгімонта Аўгуста (1548 (1529)–1579).

Неабходнасць удасканалення адміністрацыйна-тэрытарыяльнай структуры ВКЛ. Пачатак і завяршэнне гэтага працэсу. Земская рэформа 1563–1566 гг., яе сутнасць і значэнне.

Фарміраванне пануючага саслоўя. Эвалюцыя найменняў асобных яго груп. Правы і абавязкі шляхецкага саслоўя. Склад шляхты ВКЛ па этнічным паходжанні і веравызнанні. Вярхі шляхецкага саслоўя – князі, паны (панове, магнаты), паняты. Іх матэрыяльны стан і роля ў дзяржаве. Ідэя агульнадзяржаўнага адзінства.

Велікакняжацкая ўлада і магнаты. Значэнне і роля паны-рада як дарадчага органа пры вялікім князі. Паступовае аслабленне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўлады вялікага князя. Розныя навуковыя погляды на ўзнікненне сейма. Эвалюцыя яго ролі і ўплыву. Пашырэнне правоў усяго саслоўя шляхты, ператварэнне яе ў палітычна пануючае саслоўе. Павятовыя сеймікі. Судовая сістэма. Галоўны Літоўскі трыбунал.

### *Тэма 15. Станаўленне феадальнай сістэмы ў XV–XVI стст.*

Пераемнасць працэсу феадалізацыі ў перыяд ад ранняга да позняга Сярэднявечча. Яго адметнасці ў Вялікім Княстве Літоўскім. Розныя шляхі фарміравання вотчыннага землеўладання і значэнне гэтай з'явы. Эвалюцыя эканамічнага і прававога статусу сялянства на працягу XV ст. Узровень сельскагаспадарчай вытворчасці ў гэты перыяд. Першыя фальваркі ў Беларусі. Вызначэнне тэрміна «фальварак», заканамернасць іх узнікнення, арэал распаўсюджвання, эканамічнае значэнне.

Неабходнасць ажыццяўлення рэформ у сельскай гаспадарцы. Ініцыятыва землеўласнікаў па рэфармаванні сваіх маёнткаў. Сутнасць валочнай памеры, рэгіёны яе правядзення. «Устава на валокі» 1557 г. Наступствы аграрнай рэформы. Рэгламентацыя павіннасцей, іх залежнасць ад памераў і якасці надзелу. Асноўныя групы сялянства: чэлядзь нявольная, людзі непахожыя, людзі пахожыя, сяляне-слугі. Пашырэнне сістэмы прыгоннага права, яе юрыдычнае афармленне ў Статутах 1566 і 1588 гг.

### *Тэма 16. Гарады Беларусі ў XV–XVI стст.*

Роля гарадоў у эканамічным і палітычным жыцці дзяржавы. Асаблівасці развіцця гарадоў Беларусі ў XIV–XV стст. Саслоўная структура горада. Уплыў унутранага рынку на працэс урбанізацыі. Зацікаўленасць феадалаў у гарадскіх пасяленнях на сваіх землях. Падатковая роля гарадоў.

Магдэбургскае права, яго сутнасць і адміністрацыйная структура. Фарміраванне мяшчанскага саслоўя. Правы гараджан паводле магдэбургскага права. Абарона дзяржаўнай уладай інтарэсаў буйнейшых гарадоў. Прыватнаўласніцкія гарады. Мястэчкі.

Далейшае развіццё рамёстваў, спецыялізацыя гарадоў. Унутраны гандаль і ўзровень фарміравання ўнутранага рынку. Галоўныя кірункі знешняга гандлю. Фарміраванне купецтва. Змест экспарту. Грашовае абарачэнне. Цэхавая арганізацыя рамяства і гандлю, яе сутнасць, значэнне і наступствы.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

### *Тэма 17. Знешне- і ўнутрыпалітычнае становішча Вялікага Княства Літоўскага ў другой палове XVI ст.*

Агульная характарыстыка знешняй палітыкі ВКЛ у першай палове XVI ст. Прычыны Лівонскай вайны, баявыя дзеянні маскоўскіх войск на пачатковым этапе. Стасункі Вялікага Княства Літоўскага і Лівонскага ордэна. Віленская дамова 1559 г. і Пакта Субіктонік (Pacta Subiectonic) 1561 г. Уступленне Вялікага княства ў вайну. Баявыя дзеянні маскоўскіх войск на паўночным усходзе Беларусі ў 1562–1564 гг. Узяцце Полацка маскоўскім войскам у лютым 1563 г. Бітва на р. Ула 26 студзеня 1564 г.

Ваенныя дзеянні 1567–1570 гг. Перамір'е 1570–1576 гг. Узнаўленне баявых дзеянняў. Ваенная тактыка вялікага князя і караля Стэфана Баторыя. Капітуляцыя маскоўскага гарнізона ў Полацку 30 жніўня 1579 г. Ваенныя дзеянні пад Псковам. Заключэнне Ям-Запольскага перамір'я паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Маскоўскай дзяржавай 15 студзеня 1582 г., яго ўмовы.

Унутрыпалітычная сітуацыя падчас Лівонскай вайны. Пазіцыя шляхты ВКЛ. Рашэнні лагернага (палявога) сейма 1562 г. пад Віцебскам. Пазіцыя магнацкіх вярхоў па пытанні уніі з Польшчай. Пазіцыя вялікага князя і караля Жыгімонта II Аўгуста і польскага боку. Інкарпарацыя Падляшша і ўкраінскіх ваяводстваў у склад Польшчы. Падпісанне акта Люблінскай уніі 1 ліпеня 1569 г., яго змест і значэнне. Унутрыпалітычныя праблемы пасля заключэння уніі і іх ацэнка Жыгімонтам II Аўгустам, магнатамі і шляхтай ВКЛ. Генрыхавы артыкулы. Спроба дабіцца змен ва ўмовах уніі. Выкарыстанне перыядаў безгаспадарства 1572–1573 гг. і 1574–1576 гг. для зацвярджэння Статута 1588 г. Карэктывы ва ўмовах Люблінскай уніі.

### *Тэма 18. Рэлігійная сітуацыя ў Вялікім Княстве Літоўскім у XIV–XVI стст.*

Роля і месца праваслаўнай царквы ў перыяд фарміравання тэрыторыі ВКЛ (XIV ст.). Рэлігійная палітыка вялікіх князёў Гедыміна і Альгерда. Іх спробы стварыць праваслаўную царкоўную структуру (мітраполію) у ВКЛ. Дзеянні ў гэтым кірунку вялікага князя Вітаўта. Мітрапаліт Р. Цымбалк. Адносіны канстанцінопальскага патрыярха і Маскоўскай мітраполіі да стварэння мітраполіі ў ВКЛ. Літоўская мітраполія ў XV–XVI стст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пачатак распаўсюджвання ўплыву каталіцкай царквы ў ВКЛ. Спроба Гедыміна прыняць каталіцтва. Хрышчэнне язычнікаў-балтаў. Прывілей вялікага князя Ягайлы 1387 г. Стварэнне арганізацыйнай структуры каталіцкай царквы і прызнанне яе дзяржаўнай царквой ВКЛ. Лістоўская мітраполія ў XV–XVI стст.

Рэлігійная сітуацыя ў Еўропе ў XV – першай палове XVI ст. Пачатак пратэстанцкага руху, яго носьбіты. Ідэі Рэфармацыі і яе плыні. Рэфармацыйны рух у Беларусі і яго этнасацыяльныя асаблівасці. Пратэстанцкія абшчыны ў Беларусі. Антытрынітарызм і яго галоўныя прадстаўнікі. Праваслаўныя брацтвы як своеасаблівая форма рэлігійна-нацыянальнага руху.

Контррэфармацыя. Дзейнасць ордэна езуітаў на тэрыторыі Беларусі. Умацаванне пазіцый каталіцкай царквы. Уніяцкія тэндэнцыі ў праваслаўнай царкве ВКЛ, прычыны гэтага. Эвалюцыя пытання аб царкоўнай уніі ў XIV–XVI стст. Рашэнні Берасцейскага сабора 1596 г. аб утварэнні ўніяцкай (грэка-каталіцкай) царквы. Асноўныя палажэнні Берасцейскай царкоўнай уніі.

Распаўсюджванне уніі. Ацэнкі значэння ўніяцкай царквы для этнакультурнага развіцця Беларусі. Дзяржаўная палітыка ў адносінах да ўніяцкай царквы.

Рэлігіі этнічных меншасцей у Беларусі. Талерантнасць грамадскага жыцця.

### *Тэма 19. Фарміраванне беларускай народнасці*

Характэрныя рысы народнасці. Палітычны, эканамічны, сацыяльны і канфесіянальны фактары, якія ўплывалі на працэс фарміравання беларускай народнасці. Тэрытарыяльны кампанент пры стварэнні народнасці. Палітонім Літва. Працэс фарміравання беларускай мовы. Яе характэрныя рысы і роля ў дзяржаве. Паступовае фарміраванне самасвядомасці беларускага этнасу. Русіны (русічы), літвіны, палешукі.

Шляхі фарміравання матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў. Змены ў паўсядзённай культуры (новыя тыпы паселішчаў, новая планіроўка, новыя віды народнага адзення і г.д.). Далейшае развіццё духоўнай культуры – фальклор, абрадавая песенная творчасць, гістарычныя песні і паданні. Тэатральныя відовішчы. Карагоды, скамарохі, батлейка. Новыя музычныя інструменты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Варыянты паходжання назвы «Белая Русь». Змест назвы «Белая Русь».

### *Тэма 20. Духоўная і матэрыяльная культура Беларусі ў перыяд Адраджэння (XIV–XVI стст.)*

Асноўны змест еўрапейскага Адраджэння. Пераемнасць гуманістычных ідэй у культуры Беларусі. Спалучэнне агульнаеўрапейскіх рыс і мясцовых асаблівасцей у развіцці беларускай культуры.

Кнігадрукаванне як галоўная ўмова распаўсюджання ідэй Адраджэння. Беларускае кнігадрукаванне. Асоба Францыска Скарыны, яго кнігавыдавецкая дзейнасць. Друкарні ў Беларусі. «Берасцейская, ці Радзівілаўская Біблія». Брацкае кнігадрукаванне.

Літаратурны працэс на беларускіх землях. М. Гусоўскі. Панегірыкі. «Пахвала Вітаўту», «Пахвала гетману Канстанціну Астрожскаму». Перакладная літаратура. «Аповесць пра трох каралёў», «Александрыя» і інш. Перакладчыцкая дзейнасць Ф. Скарыны. Дыярыўшы. М. Радзівіл Сіротка, Фёдар Еўлашоўскі і інш.

Рэнесансна-гуманістычныя погляды мысліцеляў і асветнікаў Беларусі: Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, Міхаіл Літвін, Андрэй Волан, Саламон Рысінскі і інш. Дасягненні ў прававой галіне. Статуты Вялікага Княства Літоўскага 1566 і 1588 гг. Леў Сапега. Уклад у еўрапейскую навуку. Казімір Семяновіч. Мялецій Сматрыцкі. «Гіпіка» К. Дарагастайскага.

Матэрыяльная культура. Беларускае барока. Жывапіс. Гравюры.

### *Тэма 21. Становішча Вялікага Княства Літоўскага ў першай палове XVII ст.*

Вялікае Княства Літоўскае як складовая частка федэратыўнай дзяржавы – Рэчы Паспалітай. Новая рэлігійная сітуацыя.

Дынастычныя інтарэсы вялікіх князёў і каралёў з дынастыі Ваза і іх ажыццяўленне. Жыгімонт III Ваза як кароль Польшчы і Швецыі. Вайна Рэчы Паспалітай і Швецыі 1600–1629 гг. і ўдзел у ёй войска ВКЛ. Гетман Я. К. Хадкевіч. Кірхгольмская бітва 1605 г.

Удзел Рэчы Паспалітай у падзеях «смутнага часу» ў Маскоўскай дзяржаве ў 1609–1612 гг., падтрымка Ілжэдзмітрыя I

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і Ілжэдзмітрыя ІІ. Аблога Смаленска 1609–1611 гг. Абранне на царства каралевіча Уладзіслава. Планы Жыгімонта ІІІ аб уніі Рэчы Паспалітай і Рускай дзяржавы. Капітуляцыя польска-беларускага гарнізона ў Крамлі (лістапад 1612).

Стан сельскай гаспадаркі і гарадоў. Пашырэнне антыфеадальных настрояў сярод сельскага і гарадскога насельніцтва. Розныя формы супраціўлення. Паўстанне пад кіраўніцтвам Севярына Налівайкі ў Беларусі (1595). Паўстанне гараджан г. Магілёва ў 1606 г.

### *Тэма 22. Казацка-сялянскія паўстанні на тэрыторыі Беларусі ў сярэдзіне XVII ст. Беларусь падчас вайны Расіі і Рэчы Паспалітай (1654–1667)*

Перадумовы казацка-сялянскіх выступленняў у Беларусі ў 1648–1651 гг. Сацыяльны склад яе ўдзельнікаў і іх мэты. Характар казацка-сялянскага руху. З'яўленне казацкіх загонаў на поўдні Беларусі. Пачатак узброенай барацьбы, яе метады. Меры вялікага гетмана літоўскага Януша Радзівіла па падаўленні паўстання. Падзеі ў г. Пінску ў кастрычніку 1648 г. Абарона г. Мазыра ў лютым 1649 г. Падзеі ў Бабруйску і Рэчыцы. Вынікі баявых дзеянняў войск ВКЛ.

Уздым паўстання на паўднёвым усходзе Беларусі. Бітва пад Лоевам 31 ліпеня 1649 г. Падаўленне паўстання ў 1651 г. на тэрыторыі Беларусі. Умовы Белацаркоўскага пагаднення 18 верасня 1651 г. Наступствы казацка-сялянскіх выступленняў.

Прычыны вайны паміж Рускай дзяржавай і Рэччу Паспалітай. Ідэалагічная падрыхтоўка. Пачатак баявых дзеянняў. Адносіны розных слаёў насельніцтва да маскоўскага войска на першым этапе вайны (май – снежань 1654 г.). Яго паводзіны на беларускай тэрыторыі. Перамены ў стаўленні насельніцтва. Атрады шышоў. Контрудары войска Вялікага Княства Літоўскага зімой 1655 г. Наступленне рускіх войск летам 1655 г. на Вільню і іншыя гарады. Прыняцце Аляксеем Міхайлавічам тытула «ўсяе Вялікія, Малыя і Белыя Русі самадзержца». Тактыка маскоўскіх войск. Палітыка прымусовага перасялення беларускага насельніцтва. Масавы адыход насельніцтва ад прысягі маскоўскаму цару.

Нападзенне Швецыі на Польшчу. Кейданаўская унія (1655) вялікага гетмана літоўскага Януша Радзівіла са Швецыяй і яе ацэнка. Руска-шведская вайна 1656 г., уплыў яе вынікаў на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

перамовы аб міры Расіі з Рэччу Паспалітай. Заключны этап вайны. Умовы Андросаўскага (Андрусаўскага) перамір'я 1667 г. «Вечны мір» 24 красавіка 1686 г. і яго наступствы.

### *Тэма 23. Унутры- і знешнепалітычнае становішча Вялікага Княства Літоўскага ў апошняй трэці XVII–XVIII ст.*

Прычыны і праявы эканамічнага заняпаду Беларусі ў апошняй трэці XVII ст. Розныя шляхі яго пераадолення і пазіцыя шляхты.

Процілеглыя пазіцыі правячага саслоўя падчас выбараў караля і вялікага князя. «Пясты» на троне. Унутрыпалітычная сітуацыя. Праявы «літвінскага сепаратызму». Рашэнні 1696 г. Барацьба магнацкіх груповак у канцы XVII ст. за ўладу ў ВКЛ. Варагуючыя кааліцыі магнатаў – Сапег, Агінскіх, Пацаў, Вішнявецкіх. Грамадзянская вайна паміж імі. Бітва пад Вількамірам 8 ліпеня 1701 г. і паражэнне Сапег.

Абставіны ўступлення Рэчы Паспалітай у Паўночную вайну паміж Швецыяй і Расіяй (1700–1721). Процілеглыя пазіцыі шляхты ВКЛ і Польшчы. З'яўленне летам 1702 г. шведскіх войск на тэрыторыі Беларусі. Шляхецкія канфедэрацыі. Падтрымка шведамі кандыдатуры Станіслава Ляшчынскага на пасаду вялікага князя і караля. Уступленне на тэрыторыю Беларусі рускіх войск восенню 1704 г. Ваенныя дзеянні 1706–1708 гг. Бітва каля м. Галоўчын (ліпень 1708 г.), в. Лясная (кастрычнік 1708 г.). Наступствы баявых дзеянняў для Беларусі.

Унутрыпалітычная сітуацыя ў дзяржаве ў XVIII ст. Непасрэднае ўмяшальніцтва замежных дзяржаў у працэс абрання манарха. Палітычныя мэты вялікіх князёў і каралёў – Аўгуста II і Аўгуста III. Асоба Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Працэс яго абрання. Палітычная арыентацыя апошняга польскага караля і вялікага князя літоўскага. Першы падзел Рэчы Паспалітай.

### *Тэма 24. Эканамічнае развіццё Вялікага Княства Літоўскага ў XVIII ст.*

Уплыў ваенных дзеянняў 1702–1708 гг. на эканоміку Беларусі. Стаўленне землеўласнікаў да агратэхнічных новаўвядзенняў. Фізіякраты. Прыклады перадавых метадаў гаспадарання: Паўлаўская рэспубліка, рэформы І. Храптовіча ў Шчорсах.

Стан гарадоў пасля Паўночнай вайны. Узаемадачыненні шляхты і жыхароў горада. Асаблівасці магдэбургскага права ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

беларускіх гарадах. Перамены ў стане насельніцтва прыватнаўласніцкіх гарадоў. Сеймавая пастанова 1764 г. Закон 1768 г. аб дзяржаўных гарадах. Рашэнні сейма 1776 г. аб пазбаўленні невялікіх гарадоў і мястэчак магдэбургскага права. Перамены ў стане мяшчанства па сеймавым рашэнні 1775 г. і законе аб гарадах 17 сакавіка 1791 г.

Традыцыйная пазіцыя шляхты ў адносінах да ўдзелу ў эканамічным развіцці краіны. Зараджэнне шляхецкага прадпрымальніцтва. Мацей Бутрымовіч. Міхаіл Казімір Агінскі. Рэформы Антонія Тызенгаўза ў каралеўскіх эканоміях. Гарадніца – прадмесце тагачаснай Гародні – адлюстраванне дзейнасці А. Тызенгаўза. Стварэнне вотчынных мануфактур ва ўладаннях Радзівілаў і ацэнка гэтай з'явы.

Эвалюцыя сялянскіх павіннасцей, іх колькасць і матэрыяльнае выражэнне. Розныя формы эканамічнага (пасіўнага) супраціўлення: ажыццяўленне куплі і продажу зямлі, скарачэнне надзелу і распрацоўка пустак. Сялянскія скаргі (суплікі). «Мядовы бунт» у Слонімскім старостве як прыклад актыўнага супраціўлення. Узброеныя сродкі барацьбы. Сялянскае паўстанне 1740–1744 гг. у Крычаўскім старостве. Яго прычыны, падрыхтоўка, ход, вынік і наступствы. Паўстанне ва ўладаннях Віленскага капітула на Каменшчыне Мазырскага павета.

### *Тэма 25. Ідэалагічная праграма пануючага саслоўя Вялікага Княства Літоўскага*

Светапогляд шляхты і стыль жыцця. Сарматызм і яго праяўленне ў дэкаратыўным мастацтве, адзенні, узбраенні. Наданне сарматызму палітычнага значэння. Літоўскі сепаратызм.

Сутнасць залатых шляхецкіх вольнасцей. Эвалюцыя іх фарміравання як адлюстраванне ўзрастання ўплыву шляхты. Права на стварэнне ваенна-палітычных саюзаў – канфедэрацый і ўзброеную барацьбу – рокаш. Рокаш 1606–1609 гг. Ацэнка права «liberum veto». Выбары караля і вялікага князя. Павятовыя сеймікі.

Сутнасць і вытокі рэлігійнага (дысідэнцкага) пытання ў ВКЛ. Уплыў умоў «Вечнага міру» 1686 г. на яго абвастрэнне. Дзяржаўная палітыка ў адносінах да праблемы дысідэнтаў (праваслаўных і пратэстантаў). Становішча праваслаўнай царквы ў Беларусі. Дзейнасць Георгія Каніскага. Дысідэнцкая праблема як падстава стварэння шляхецкіх канфедэрацый і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўмяшальніцтва замежных дзяржаў ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай. Стварэнне Беларускай праваслаўнай епархіі пасля першага падзелу. Рашэнні «Генеральнай кангрэгацыі» 15 чэрвеня 1791 г. у Пінску.

### *Тэма 26. Сістэмны крызіс Рэчы Паспалітай і спробы захавання дзяржавы*

Сістэмная ўзаемасувязь разнастайных праяў крызісу Рэчы Паспалітай. Тры плыні ў правячым саслоўі па пошуку шляхоў выйсця з крызісу. Групоўка Чартарыйскіх. Пачатак рэформ. Чатырохгадовы сейм (1788–1792) і яго рашэнні. Канстытуцыя 1791 г., стаўленне да яе розных шляхецкіх плыняў. Таргавіцкая канфедэрацыя. Пазіцыя караля і вялікага князя С. А. Панятоўскага. Наступствы канфедэрацыі. Другі падзел Рэчы Паспалітай.

Заканамернасць узнікнення патрыятычнага ўздыму пасля падзей 1793 г., падрыхтоўка паўстання ў Польшчы. Тадэвуш Касцюшка. Паланецкі ўніверсал. Асаблівасці падрыхтоўкі паўстання ў Вялікім Княстве Літоўскім. Асоба Якуба Ясінскага. Дзве плыні ў паўстанні – радыкальная і памяркоўная. Ажыццяўленне плана ўзброенага паўстання, захоп Вільні 23 красавіка 1794 г. Прыняцце «Акта Паўстання Народу Вялікага Княства Літоўскага» (Віленскага акта) і стварэнне Рады Нацыянальнай Правінцыйнай. Літоўскі сепаратызм.

Распаўсюджванне паўстання на беларускія паветы. Перамены ў кіраўніцтве паўстаннем у маі 1794 г. Стварэнне новых органаў кіравання – Найвышэйшай Нацыянальнай Рады і Цэнтральнай дэпутацыі Вялікага Княства Літоўскага, перамены ў арганізацыі войска. Стаўленне да Я. Ясінскага. Ужыванне партызанскай тактыкі. М. К. Агінскі, Ст. Грабоўскі. Буйнейшыя бітвы паўстанцаў на тэрыторыі Беларусі.

Апошні этап паўстання (жнівень–верасень). Бітва пад Мацяёвіцамі 10 кастрычніка 1794 г. Палон Т. Касцюшкі. Баі за Варшаву (лістапад 1794 г.). Тамаш Ваўжэцкі. Вынікі, значэнне і наступствы паўстання 1794 г.

### *Тэма 27. Духоўная і матэрыяльная культура Беларусі ў XVII–XVIII стст.*

Ідэі Асветніцтва як галоўны падмурак развіцця матэрыяльнай і духоўнай культуры. Неабходнасць удасканалення школь-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

най адукацыі. Рэформа ў школах ордэна піяраў (40-я гг. XVIII ст.). Дзейнасць Адукацыйнай камісіі (1773–1784). Сутнасць адукацыйнай рэформы, стаўленне да яе розных слаёў грамадства. Распаўсюджванне навуковых ведаў. Навуковыя колы Галоўнай школы Вялікага Княства Літоўскага (Віленскі ўніверсітэт). Уплыў дзяржаўных рашэнняў на стан беларускай народнай культуры.

Культурныя цэнтры Беларусі. Слонімскі тэатр М. К. Агінскага. Уршуля Радзівіл. Мацей Радзівіл. Школьныя тэатры. Свецкі характар тэатральнай культуры. Мецэнацкая дзейнасць магнатаў. Мемарыяльная культура. Выяўленчае мастацтва. Дойлідства, архітэктура. Барока і ракако. Літаратура. Сімяон Полацкі. Саламея Пільштынава. Юльян Нямцэвіч.

## 2.2 Развіццё Беларусі ў складзе Расійскай імперыі

### *Тэма 28. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі (апошняя чвэрць XVIII – пачатак XIX ст.)*

Перамены ў эканамічным, палітычным і сацыяльным стане беларускіх зямель пасля далучэння іх да Расійскай імперыі. Адміністрацыйныя рэформы 1796 і 1801 гг. Генерал-губернатарствы. Губерні. Паветы. Саслоўная палітыка. Стаўленне пануючага саслоўя Вялікага Княства Літоўскага да самадзяржаўя, працэдура прысягі і яе вынікі.

Разбор шляхты і перавод яе ў склад падатных саслоўяў. Рэкрутчына. Палітыка ўрада Кацярыны II адносна землеўладання і гарадоў. Раздача былых дзяржаўных і канфіскаваных зямельных уладанняў. «Жалаваная грамата гарадам 1795 г.» у дачыненні да беларускіх гарадоў. Змены ў сістэме гарадскога кіравання. Выкуп прыватных гарадоў і мястэчак.

Рэлігійная палітыка царызму. Прымусовы перавод уніятаў у праваслаўе пры Кацярыне II. Прыхільныя адносіны да езуітаў. Адкрыццё Полацкай езуіцкай акадэміі. Перамены ў канфесіянальнай палітыцы пры Паўле I і Аляксандры I. Мяжа яўрэйскай аселасці.

Пачатак навуковага вывучэння тэрыторыі Беларусі. Палітыка царызму ў сістэме адукацыі. Віленскі ўніверсітэт і Віленская вучэбная акруга.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 29. Беларусь у вайне 1812 г.*

Расійска-французскія адносіны і палітычная сітуацыя ў беларускіх губернях напярэдадні вайны 1812 г. Тэрыторыя Беларусі – стратэгічны плацдарм і база харчавання для рускай арміі. Праекты аўтаноміі Вялікага Княства Літоўскага ў складзе Расіі (А. Чартарыйскі, М. К. Агінскі).

Пачатак вайны. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі летам 1812 г. Абарончыя баі каля м. Мір і Клясціцы і в. Салтанаўка. Супрацьлеглыя пазіцыі беларускай шляхты: прафранцузская і праруская. Спадзяванні на аднаўленне Вялікага Княства Літоўскага. Тэрыторыя Беларусі як крыніца людскіх і матэрыяльных рэсурсаў для ваюючых краін. Палітыка французскіх акупацыйных улад. Стварэнне Часовага ўрада, яго задачы. Метады партызанскай барацьбы беларускага насельніцтва. Адступленне французскай арміі восенню 1812 г., пераправа цераз р. Бярэзіну. Вызваленне тэрыторыі Беларусі. Заканчэнне вайны і яе наступствы для Беларусі.

### *Тэма 30. Сацыяльна-эканамічнае становішча беларускіх губерняў у першай палове XIX ст.*

Эканамічнае развіццё беларускіх губерняў і іх уключэнне ў агульнарасійскі рынак. Спецыялізацыя ў сельскай гаспадарцы, распаўсюджанне тэхнічных культур і іх значэнне для з'яўлення новых галін вытворчасці. Далейшае развіццё таварнай вытворчасці ў сельскай гаспадарцы. Першыя памешчыкі-прадпрымальнікі.

Сацыяльная дыферэнцыяцыя сялянства. Спробы рацыяналізацыі прыгонніцкай сістэмы гаспадарання. Закон «Аб вольных хлебаробах» і прыклады яго ўжывання ў Беларусі. Пытанне аб статусе выбранцаў. Люстрацыя дзяржаўных маёнткаў і пачатак інвентарызацыі памешчыцкіх маёнткаў. Значэнне і наступствы гэтых рэформ.

Развіццё гарадоў і мястэчак. Перамены ў гарадской структуры. Пытанне аб статусе жыхароў мястэчак. Узнікненне капіталістычных мануфактур і першых фабрык. Крамны гандаль і кірмашы. Пашырэнне ўнутранага рынку.

### *Тэма 31. Грамадска-палітычны рух у першай палове XIX ст.*

Сацыяльны склад і ідэалагічны змест грамадска-палітычнага руху. Захаванне рэвалюцыйных настрояў сярод беларускай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шляхты. Узнікненне так званага «польскага пытання» і шляхі яго вырашэння. Тайныя таварыствы моладзі: прамяністыя, філаматы, філарэты.

Дзекабрысты ў Беларусі. М. Мураўёў, «мінскі» варыянт яго канстытуцыі. План паўстання ў Бабруйскай крэпасці. «Саюз верных братоў» у Літоўскім корпусе. Асобы М. Рукевіча, К. Інгельстрома і інш. Спроба паўстання ў Літоўскім корпусе. Лёс беларускіх дзекабрыстаў.

Паўстанне 1830–1831 гг., яго мэты, сацыяльны склад, ход і значэнне. Прычыны паражэння паўстання. Наступствы паўстання для Беларусі: «разбор шляхты», эміграцыя паўстанцаў, іх высылка за межы Беларусі. Рашэнні ў галіне адукацыі і рэлігійнага жыцця. Прадаўжэнне працэсу русіфікацыі. «Дэмакратычнае таварыства». Ф. Савіч. «Саюз свабодных братоў».

### *Тэма 32. Культура Беларусі ў першай палове XIX ст.*

Зараджэнне беларускага нацыянальна-культурнага руху ў асяродку выкладчыкаў і студэнтаў Віленскага ўніверсітэта. Фарміраванне ў шляхецкім асяродку ўяўлення аб беларускім (літоўскім) паходжанні. Значэнне ўжывання беларускай мовы ва ўніяцкіх школах і богаслужэннях.

Дзейнасць А. Чартарыйскага на пасадзе куратара Віленскай вучэбнай акругі па стварэнні сеткі польскамоўных школ. Творчасць Я. Чачота, Т. Зана, Я. Баршчэўскага, А. Рыпінскага, П. Шпілеўскага. Паўлюк Багрым. В. Дунін-Марцінкевіч. Адам Міцкевіч і беларускія матывы яго творчасці.

Музычная культура. Творчасць С. Манюшкі. Аматарскія канцэрты. Мастацкая творчасць. В. Ваньковіч. І. Хруцкі. Тэатр прафесійны і аматарскі.

Пачатак беларускай археалогіі і крыніцазнаўства.

### *Тэма 33. Адмена прыгоннага ладу. Рэформа 1861 г.*

Неабходнасць адмены прыгоннага ладу і ажыццяўлення рэформ у сельскай гаспадарцы. Унутрыпалітычная сітуацыя 50-х гг. XIX ст. Падрыхтоўчы этап рэформы, розныя яе варыянты. Рэскрыпт Аляксандра II віленскаму генерал-губернатару А. Назімаву. Пазіцыя землеўласнікаў Паўночна-Заходняга краю.

Маніфест 19 лютага 1861 г. Значэнне адмены прыгоннага ладу. Механізм правядзення рэформы ў памешчыцкіх гаспа-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дарках беларускіх губерняў. «Агульнае палажэнне» і «Мясцовыя палажэнні», асаблівасці іх ужывання ў заходніх і ўсходніх частках Беларусі. Надзяленне сялян зямлёй на ўмовах пастаяннага карыстання, розныя варыянты сялянскіх надзелаў. Часоваабавязаны стан і павіннасці сялян. Сутнасць выкупной аперацыі. Міравыя пасрэднікі. Прычыны з’яўлення ў беларускіх губернях царскага загада ад 1 сакавіка 1863 г. і яго змест. Значэнне рэформы 1861 г. Землеўпарадкаванне дзяржаўных сялян у 1867–1876 гг.

### *Тэма 34. Паўстанне 1863–1864 гг. у Беларусі і яго наступствы*

Зараджэнне рэвалюцыйна-дэмакратычнай плыні ў асяроддзі беларускай шляхецкай моладзі. Патрыятычныя маніфестацыі ў 1861–1862 гг. у гарадах Беларусі. Дзейнасць К. Каліноўскага па стварэнні рэвалюцыйнай арганізацыі на Гродзеншчыне. «Мужыцкая праўда». Літоўскі правінцыяльны камітэт (1862) і падрыхтоўка да паўстання. Тры плыні (белыя, чырвоныя правыя, чырвоныя левыя) нацыянальна-вызваленчага руху, агульнае і асаблівае ў іх праграмах. Пазіцыя К. Каліноўскага па нацыянальным і аграрным пытаннях.

Пачатак паўстання 1863 г. і барацьба ў яго кіраўніцтве. Сацыяльны склад паўстанцаў. Баявыя дзеянні паўстанцкіх атрадаў В. Урублеўскага, Р. Траўгута і інш. Бой пад Мілавідамі. М. М. Мураўёў. Тэрор супраць паўстанцаў. Падаўленне паўстання. К. Каліноўскі, яго «Лісты з-пад шыбеніцы». Палітыка царскага ўрада пасля заканчэння паўстання. Рэпрэсіі. Высяленне ў Сібір. Эміграцыя паўстанцаў. Наступствы паўстання. Страты ў духоўным патэнцыяле Беларусі.

### *Тэма 35. Эканамічнае развіццё Беларусі ў другой палове XIX ст. Рэформы 1860–1870-х гг.*

Буржуазныя рэформы 1860–1870-х гг.: судовая, цэнзурная, школьная, гарадская, ваенная. Асаблівасці правядзення земскай рэформы ў беларускіх губернях.

Адмоўныя тэндэнцыі ў развіцці сельскай гаспадаркі. Структура землеўладання ў Паўночна-Заходнім краі. Праблема сервітутаў. Першыя праявы капіталізму ў сельскай гаспадарцы. Дзейнасць Сялянскага пазямельнага банка. Уплыў крызісу канца XIX ст. на сельскую гаспадарку Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Фарміраванне прыкмет капіталістычнай эканомікі ў прамысловасці. Асаблівасці прамысловага перавароту ў беларускіх губернях. Галіновая структура прамысловасці. Будаўніцтва чыгунак. Рост гарадоў. Развіццё транспартнай сістэмы, сродкаў сувязі, гарадской інфраструктуры. Знешні і ўнутраны гандаль. Грашовая сістэма. Банкі. Прыток замежнага капіталу. Фарміраванне буржуазіі і рабочага класа, асаблівасці іх нацыянальнага складу.

### *Тэма 36. Грамадска-палітычнае жыццё беларускіх губерняў у другой палове XIX ст.*

Прадаўжэнне палітыкі русіфікацыі ў галіне асветы. Пашырэнне расійскага памешчыцкага землеўладання. Абмежаванне ўжывання польскай мовы. Дыскрымінацыя яўрэйскага насельніцтва. Канфесіянальная палітыка царскага ўрада.

Пачатак адраджэння рэвалюцыйнага руху ў 1870-х гг. у форме народніцтва. Народныя гурткі ў Беларусі і іх арыентацыя на «Чорны перадзел». Вядомыя беларускія нарадавольцы І. Грынявіцкі, А. Бонч-Асмалоўскі, С. Кавалік і інш.

Першыя рабочыя хваляванні ў 1870–1880-х гг. Зараджэнне сацыял-дэмакратычнага руху і першых марксісцкіх гурткоў. І з'езд РСДРП. Утварэнне БУНДа, СДКПіЛ, ППС у Літве, партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў (эсэраў). Першая беларуская нацыянальная палітычная партыя – БСГ. «Паліцэйскі сацыялізм».

### *Тэма 37. Эканамічнае і грамадска-палітычнае развіццё Беларусі ў пачатку XX ст.*

Асноўныя галіны вытворчасці, яе буйнейшыя цэнтры. Месца Беларусі ў структуры агульнарасійскай вытворчасці і рынку. Асаблівасці мадэрнізацыі ў Беларусі. Урбанізацыя. Першыя манапалістычныя аб'яднанні. Этнічная прыналежнасць эканамічных вярхоў і рабочага класа беларускіх губерняў. Жыццёвы ўзровень і ўмовы працы рабочых. Буйнейшыя прадпрымальнікі Беларусі.

Далейшае развіццё транспартнай і банкаўскай сістэмы. Замежны капітал у эканоміцы Беларусі. Ператварэнне Мінска ў галоўны эканамічны цэнтр.

Праблемы аграрнага сектара эканомікі ў пачатку XX ст. Перажыткі феадалізму ў вёсцы. Тэрытарыяльная і сацыяльная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мабільнасць насельніцтва. Неабходнасць рэфармавання сельскай гаспадаркі. Сталыпінская аграрная рэформа як комплекс мер па пераводзе сельскай гаспадаркі на капіталістычны шлях. Новыя формы гаспадарання. Вынікі сталыпінскай аграрнай рэформы.

Змены ў кіраванні беларускімі губернямі. Рост чыноўніцкага апарату. Увядзенне паўземстваў (1903). Земская рэформа 1911 г. Роля земстваў у грамадскім жыцці. Вынікі эканамічнага развіцця Беларусі перад пачаткам Першай сусветнай вайны.

## *Тэма 38. Працэс фарміравання беларускай нацыі. Беларускі нацыянальны рух*

Умовы фарміравання нацыі: агульнасць тэрыторыі і эканамічнага жыцця, наяўнасць высокаразвітой культуры і літаратурнай мовы. Дзве плыні па пытанні фарміравання беларускай нацыі – асімілятарская (польская і руская) і нацыянальная. «Западноруссизм» і М. Каяловіч.

Актывізацыя навуковага вывучэння этнаграфіі, фальклору, гісторыі беларускага народа. Працы А. Кіркора, І. Насовіча, П. Шэйна, Е. Раманава і інш. Выданне зборнікаў гістарычных крыніц. А. Сапуноў. М.Доўнар-Запольскі.

Эканамічныя стасункі розных рэгіёнаў Беларусі. Дзейнасць аб’яднанняў сельскіх гаспадароў у беларускіх губернях, іх роля ў фарміраванні адзінай эканамічнай прасторы.

Прадвеснікі беларускага нацыянальнага руху Ян Чачот, В. Дунін-Марцінкевіч, К. Каліноўскі. Пашырэнне беларускай нацыянальнай ідэі сярод адукаваных колаў шляхты. Ф. Багушэвіч, А. Гурыновіч, Я. Лучына і інш. Пачатак фарміравання літаратурнай мовы. Фарміраванне нацыянальнай інтэлігенцыі.

Гурткі студэнтаў–выхадцаў з Беларусі ў Пецярбургу. Газета «Гоман». Абгрунтаванне існавання самастойнага беларускага этнасу. Дзейнасць братоў І. і А. Луцкевічаў у Мінску. Стварэнне «Студэнцкага гуртка народнай асветы» і арганізацыі «Беларуская рэвалюцыйная грамада». З 1903 г. Беларуская сацыялістычная грамада. Праграма БСГ. Сацыяльны склад беларускага нацыянальнага руху, два яго кірункі. Беларускія дыяспары і нацыянальна-культурныя суполкі ў Пецярбургу і іншых расійскіх гарадах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Тэма 39. Рэвалюцыя 1905–1907 гг. і яе ўплыў на развіццё беларускай культуры*

Прычыны і пачатак рэвалюцыйных выступленняў у студзені–верасні 1905 г. Аграрнае пытанне і масавыя выступленні сялянства. Узнікненне кааліцыйных, забастовачных камісій, саветаў і камітэтаў. Забастоўкі рабочых эканамічнага характару. Роля рэвалюцыйных партый – РСДРП, эсэраў, БСГ у арганізацыі рабочага і сялянскага руху. Стварэнне кааліцыйных саветаў і камітэтаў падчас Усерасійскай палітычнай стачкі ў кастрычніку 1905 г. Царскі Маніфест 17 кастрычніка 1905 г. «Курлоўскі расстрэл» у Мінску. Утварэнне прафсаюзаў, буржуазных партый. Салдацкія хваляванні ў снежні 1905 г.

Выбары ў Дзяржаўную думу. Дэпутаты ад Беларусі ў I і II Дзяржаўных думах і іх пазіцыя па зямельным пытанні. Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух у 1905–1907 гг. Трэцячэрвеньскі пераварот 1907 г. і заканчэнне рэвалюцыі. Уплыў рэвалюцыі 1905–1907 гг. на беларускі нацыянальны рух.

## *Тэма 40. Развіццё культуры Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.*

Афіцыйная палітыка ў галіне адукацыі. Пачатковая адукацыя і царкоўна-прыходскія школы. Зараджэнне прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Настаўніцкія семінарыі. Настаўніцкія інстытуты ў Віцебску, Магілёве, Мінску.

Беларуская літаратура другой паловы XIX – пачатку XX ст. Ф. Багушэвіч. Я. Купала. Я. Колас. М. Багдановіч. К. Каганец (Кастравіцкі). «Аплакваючая» плынь у літаратуры. Уплыў рэвалюцыі 1905–1907 гг. на развіццё беларускай нацыянальнай культуры. Роля газет «Наша доля» і «Наша ніва» ў разгортванні нацыянальнага руху. Вільня – цэнтр беларускага нацыянальнага адраджэння. Заснаванне беларускага нацыянальнага тэатра. І. Буйніцкі, Ф. Ждановіч, У. Галубок. Першыя драматычныя творы беларускіх пісьменнікаў.

Культурна-асветніцкая дзейнасць дэмакратычнай рускай інтэлігенцыі ў Мінску і іншых гарадах Беларусі. Аматарскія аб’яднанні – урачоў, аматараў прыгожых мастацтваў і інш.

Палітыка царызму ў галіне культуры. Аб’яднанне шавіністычных колаў вакол газет «Крестьянин», «Белорусский вестник». Супрацьдзеянне беларускаму адраджэнню.

Зараджэнне беларускага нацыянальнага стылю ў выяўленчым мастацтве. К. Алькімовіч, Н. Орда, Н. Сілівановіч, В. Бя-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лыніцкі-Біруля. Браты Гараўскія, Я. Драздовіч, Х. Суцін. Архітэктура.

Цэнтры культурна-адраджэнскага руху па-за межамі Беларусі – Санкт-Пецярбург, Масква і інш. Дзейнасць беларускага навукова-літаратурнага гуртка студэнтаў Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта. Б. Эпімах-Шыпіла. Пастаноўка «Паўлінкі». Выдавецтва «Загляне сонца і ў нашаваконца».

### *Тэма 41. Беларусь у гады Першай сусветнай вайны*

Прычыны, пачатак Першай сусветнай вайны. Адносіны розных колаў беларускага грамадства да ўступлення Расійскай імперыі ў вайну. Масавая мабілізацыя. Эканамічная і сацыякультурная сітуацыя ў першыя месяцы вайны.

Пачатак ваенных дзеянняў на тэрыторыі Беларусі. Прычыны паражэння расійскіх войск. Акупацыя нямецкімі войскамі заходніх паветаў Беларусі. Прычыны і наступствы масавых ўцёкаў насельніцтва (бежанства). Свянцянская і Нарачанская баявыя аперацыі. Пераход да пазіцыйнай вайны на руска-германскім фронце. Палітыка германскіх акупацыйных улад на занятай тэрыторыі ў галіне эканомікі, асветы, культуры.

Усходнія губерні Беларусі падчас вайны. Перабудова вытворчасці. Ваенныя павіннасці. Становішча насельніцтва. Беларускі нацыянальны рух падчас вайны.

### *Тэма 42. Лютаўская рэвалюцыя і ўплыў яе наступстваў на ўнутрыпалітычнае развіццё Беларусі ў лютым–кастрычніку 1917 г.*

Эканамічныя, унутры- і знешнепалітычныя прычыны наспявання сістэмнага крызісу ў Расійскай імперыі. Абвастрэнне нацыянальнага пытання на яе ўскраінах. Становішча ў арміі.

Падзеі Лютаўскай рэвалюцыі ў Петраградзе. Стварэнне саветаў і Выканкама Петраградскага савета. Пазіцыя партый расійскай буржуазіі. Адрачэнне цара Мікалая ІІ. Часовы ўрад. Сутнасць двоеўладдзя.

Адносіны Часовага ўрада да нацыянальнага пытання. Камісары Часовага ўрада ў Беларусі. Сітуацыя ў войску. Актывізацыя беларускага нацыянальнага руху. Аднаўленне БСГ. Стварэнне Беларускага нацыянальнага камітэта на чале са Р. Скірмунтам. Раскол беларускага нацыянальнага руху летам 1917 г. Стварэнне Вялікай беларускай рады і Беларускай вайсковай рады.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адносіны насельніцтва Беларусі да змены ўлады. Удзел сялянства ў выбарах новых органаў улады – валасных камітэтаў, губернскіх камісарыятаў. Асноўныя кірункі і вынікі іх дзейнасці. Выбары губернскіх, павятовых, валасных земскіх гласных у жніўні – верасні 1917 г. і скасаванне папярэдніх органаў. Саветы сялянскіх дэпутатаў і суполкі Сялянскага саюза. «Пазыка Свабоды» і адносіны да яе беларускага сялянства.

Вырашэнне зямельнага пытання. Заснаванне зямельных камітэтаў розных узроўняў. Пачатак аграрных пераўтварэнняў, адпавядаючых праграме партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў (эсэраў). Харчовае пытанне. Дзейнасць харчовых камітэтаў. Хлебная манаполія. Хлебанарыхтоўкі. Хлебныя рэквізіцыі. Правал харчовай палітыкі Часовага ўрада.

Палітычная дзейнасць партый рознага кірунку ў Беларусі. Агульныя сацыял-дэмакратычныя арганізацыі – «аб'яднанкі». Дзейнасць бальшавікоў на Заходнім фронце. Драматычныя падзеі ў пачатку ліпеня 1917 г. у Петраградзе. Канец двоеўладдзя. Мэты, ход і падаўленне ваеннага мецяжу на чале з Л. Г. Карнілавым. Бальшавізацыя саветаў.

## Раздзел III. Сацыяльна-эканамічныя і сацыяльна-палітычныя працэсы Найноўшага часу і Беларусь

### 3.1 БССР у перыяд фарміравання савецкай мадэлі развіцця

#### *Тэма 43. Кастрычніцкія падзеі ў Беларусі. Першыя пераўтварэнні савецкай улады*

Прычыны далейшага паглыблення сацыяльна-эканамічнага і палітычнага крызісу восенню 1917 г. Прапагандысцкая дзейнасць бальшавікоў. Падзеі 24–25 кастрычніка (7–8 лістапада) у Петраградзе. Першыя дэкрэты савецкай улады. Стварэнне Савета народных камісараў.

Працэс усталявання савецкай улады ў Мінску. Камітэт выратавання рэвалюцыі. Аблвыканкамзах. Усталяванне савецкай улады на неакупаванай тэрыторыі Беларусі. Ліквідацыя Стаўкі вярхоўнага галоўнакамандуючага ў Магілёве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адносіны мясцовых савецкіх органаў да беларускага пытання. Пазіцыя А. Мяснікова, К. Ландэра і інш. Усебеларускі з'езд у снежні 1917 г., яго праграма, кірункі дзейнасці. Змест прынятых пастаноў. Прычыны разгону з'езда. Пераход часткі яго дэлегатаў на паўлегальнае становішча. Стварэнне ў падполлі Выканаўчага камітэта Рады, абранай на з'ездзе, як паўнамоцнага органа нацыянальнага руху.

Пачатак пераўтварэнняў савецкай улады ў прамысловасці, банкаўскай справе, гандлі. Прадаўжэнне аграрнай палітыкі на базе праграмы эсэраў.

### *Тэма 44. Беларусь падчас нямецкай акупацыі 1918 г. Абвяшчэнне БНР*

Працэс мірных перамоў паміж дэлегацыямі савецкай Расіі і нямецка-аўстрыйскага блока. Зрыў перамоў савецкай дэлегацыяй у снежні 1917 г. Сітуацыя на тэрыторыі Беларусі. Барацьба чырвонагвардзейскіх атрадаў супраць польскага корпуса на чале з Ю. Доўбар-Мусніцкім у студзені – лютым 1918 г. Нямецкі ўльтыматум ад 10 лютага 1918 г., пачатак германскага наступлення 18 лютага. Небаяздольнасць войск Заходняга фронту. Акупацыя нямецкай арміяй большай часткі тэрыторыі Беларусі. Новыя тэндэнцыі ў германскай акупацыйнай палітыцы. Умовы Брэсцкага міру.

Эвакуацыя савецкіх органаў з Мінска 17 лютага. Выхад з падполля Выканаўчага камітэта Рады Усебеларускага з'езда. 1-я і 2-я Устаўныя граматы. Абвяшчэнне незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі 25 сакавіка 1918 г. і сучасная ацэнка гэтага акта. Непрызнанне незалежнасці БНР з боку РСФСР, Германіі і інш. Вызначэнне паўднёвай мяжы Беларусі. Стасункі з урадам незалежнай Украіны.

Адносіны беларускага народа да рабаўніцкай палітыкі нямецкіх войск. Узнікненне партызанскага руху. Рэвалюцыя ў Германіі і ануляванне Брэсцкага мірнага дагавора. Паступовае ўсталяванне савецкай улады. Пераезд урада БНР у Гародню.

### *Тэма 45. Працэс утварэння БССР. ЛітБел*

Заходняя вобласць з цэнтрам у Смаленску як дзяржаўнае ўтварэнне на тэрыторыі Беларусі ў 1917 г. Стаўленне бальшавіцкага кіраўніцтва вобласці да беларускага пытання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларускі нацыянальны камісарыят. Беларускія секцыі Расійскай камуністычнай партыі (бальшавікоў). Д. Жылуновіч (Ц. Гартны), А. Чарвякоў. Культурна-асветніцкая праца сярод бежанцаў. Нацыянальны друк, настаўніцкія курсы, Беларускі народны ўніверсітэт, беларускія школы. Дзяржаваўтваральная праграма беларускіх секцый РКП (б) і яе арганізацый. Стаўленне да БНР. Прычыны з'яўлення артыкула Д. Жылуновіча «Як жа з Беларуссю?». Рашэнні Маскоўскага камітэта беларускіх секцый РКП(б) ад 27 лістапада 1917 г.

Рашаючая стадыя ўтварэння беларускай дзяржаўнасці. Прызнанне ўрадам РСФСР савецкіх рэспублік у Эстоніі, Латвіі, Літве, Украіне. Ініцыятыва Мінскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў і Мінскага губернскага ваенна-рэвалюцыйнага камітэта ад 13 снежня 1918 г. Рашэнні канферэнцыі беларускіх секцый РКП(б) 21–23 снежня 1918 г. аб утварэнні беларускага савецкага ўрада. Супрацьдзеянне народнага камісара па справах нацыянальнасцей І. В. Сталіна, Аблвыканкамзаха, сутнасць іх пазіцыі. «Абласнікі». Перамена ўрадавай пазіцыі 25 снежня 1918 г. і яе прычыны. Рашэнні VI Паўночна-Заходняй абласной канферэнцыі РКП(б). Утварэнне Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі. Абвяшчэнне БССР (ССРБ). Склад першага савецкага беларускага ўрада.

Партыйнае рашэнне аб перадачы ўсходняй часткі БССР у склад РСФСР. Першы Усебеларускі з'езд саветаў (2 лютага 1919 г.) і яго рашэнні. Першая канстытуцыя БССР. Нацыянальны склад Цэнтральнага выканаўчага камітэта (ЦВК) і Савета народных камісараў (СНК).

Абвяшчэнне аб'яднання БССР і савецкай часткі Літвы. Ацэнка факта ўтварэння Літоўска-Беларускай рэспублікі. Склад урада, яго першыя мерапрыемствы. Нацыянальная і культурная палітыка.

### *Тэма 46. Беларусь у перыяд савецка-польскай вайны (1919–1920)*

Адраджэнне Польскай дзяржавы ў лістападзе 1918 г. і яго палітычныя мэты. Першыя ваенныя сутычкі паміж польскімі войскамі і Чырвонай арміяй у студзені – лютым 1919 г. на поўдні Беларусі і ў раёне Вільні. Два варыянты вырашэння тэрытарыяльных планаў Польшчы. Ю. Пілсудскі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Новае наступленне польскіх войск у красавіку 1919 г. Акупацыя часткі тэрыторыі ЛітБел і фактычная самаліквідацыя гэтай рэспублікі. Стабілізацыя лініі фронту ў жніўні 1919 г. па р. Бярэзіна. Жорсткая акупацыйная палітыка польскіх улад і пашырэнне антыпольскіх настрояў. Актывізацыя антыпольскага партызанскага руху. Дваістасць афіцыйнай пазіцыі польскіх улад у адносінах да беларускага нацыянальнага руху. Часовы Беларускі нацыянальны камітэт. Адмова ў прызнанні БНР. Перамовы Ю. Пілсудскага з урадам РСФСР і А. І. Дзянікіным аб межах.

Пачатак новых баявых дзеянняў у сакавіку 1920 г. у раёне Мазыра. Наступленне Чырвонай арміі Заходняга фронту ў маі 1920 г. і яго правал. Паспяховае наступленне Чырвонай арміі ў ліпені – жніўні 1920 г. Баі за Варшаву 12–16 жніўня. Пачатак і зрыў перамоў 17 жніўня. Аднаўленне баявых дзеянняў у канцы верасня 1920 г. Перамір'е 12 кастрычніка 1920 г. Захоп палякамі Мінска 15–17 кастрычніка. Спыненне баявых дзеянняў.

Працэс аднаўлення савецкай улады на тэрыторыі, вызваленай ад палякаў. Часовыя органы савецкай улады – рэвалюцыйныя камітэты. Пытанне аднаўлення БССР, барацьба супрацьлеглых пазіцый. Другое абвяшчэнне БССР 31 ліпеня 1920 г. Тэрыторыя і межы БССР у 1920 г.

Пачатак мірных перамоў у лістападзе 1920 г. Абмежаванне ўдзелу ў іх прадстаўнікоў БССР. Заключэнне Рыжскага міру 21 сакавіка 1921 г. і яго ўмовы.

### *Тэма 47. Сацыяльна-палітычнае і эканамічнае становішча БССР у перыяд новай эканамічнай палітыкі (1921–1928)*

Сацыяльна-палітычнае становішча ў Беларусі пасля заключэння перамір'я з Польшчай. Прыкметы грамадзянскай вайны. Выступленні на Случчыне ў лістападзе–снежні 1920 г. Паход арміі генерала С. Булак-Балаховіча ў Палессі. Бандытызм. Умацаванне беларускага ўчастка савецка-польскай мяжы. Рэпатрыяцыя бежанцаў і ваеннапалонных. Праблема раз'яднанасці беларускіх зямель.

Стан прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Неабходнасць рэформ. Увядзенне нэпа і яго сутнасць. Мерапрыемствы нэпа ў сельскай гаспадарцы: харчпадатак у 1921–1923 гг., пераход да грашовага падатку. Метады спагнання падатку. Працэс землеНадзялення. Рашэнні II Усебеларускага з'езда Саветаў у снежні

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1920 г. па аграрным пытанні. Стварэнне першых саўгасаў. Хутарызацыя. Арэнда. Кааперацыя. Пачатак хлебанарыхтовак і іх наступствы. Агратэхнічны стан беларускай вёскі. Прычыны спынення новай эканамічнай палітыкі ў сельскай гаспадарцы.

Стан прамысловасці Беларусі ў пачатку 1921 г. Першыя мерапрыемствы нэпа ў прамысловасці. Асноўныя галіны вытворчасці. Арэндныя адносіны. «Крызіс збыту». Матэрыяльныя ўкладанні ў прамысловасць. Пералом 1923 г. у развіцці прамысловасці. Прыватная і дзяржаўная прамысловасць. Пачатак вытворчай кааперацыі (1927). Рэзкае скарачэнне колькасці прыватных прадпрыемстваў у 1927–1928 гг.

Грашовая рэформа, увядзенне чырвонца. Інфляцыя. Вынікі развіцця эканомікі Беларусі ў 1920-я гг.

### *Тэма 48. Грамадскае і культурнае жыццё БССР у 1920-я гг.*

Стварэнне СССР. Удзел БССР у I Усерасійскай сельскагаспадарчай выставе 1923 г. Працэс фарміравання тэрыторыі БССР: узбуйненні 1924 г. і 1926 г. Канстытуцыя БССР 1927 г. Умацаванне савецкай улады і пашырэнне ўплыву партыі бальшавікоў у грамадскім жыцці. Забарона дзейнасці іншых партый, фарміраванне партыйнай эліты. Дзейнасць савецкіх, камсамольскіх, прафсаюзных органаў, «Ленінскі» заклік у партыю і змены яе сацыяльнага складу.

Асноўныя кірункі і задачы дзяржаўнай культурнай палітыкі. Стварэнне Галоўнага палітыка-асветнага камітэта (Галоўпалітасвета) і яго нізавых устаноў. Хата-чытальня. Палітыка-асветны змест работы з насельніцтвам. Кадры палітасветработы, формы работы. Культурнае асветніцтва. Аматарскія культурна-асветныя гурткі – харавыя, тэатральныя, музычныя. Распаўсюджванне нацыянальнай ідэі сярод моладзі, настаўнікаў. Культурная праграма беларускай дэлегацыі на I Усерасійскай выставе ў 1923 г. Агракультурнае асветніцтва.

Крыніцы, мэты і кірункі палітыкі беларусізацыі. Мерапрыемствы ў галіне адукацыі, дзяржаўнага кіравання, культуры, дзяржаўных моў і інш. Ліквідацыя непісьменнасці. Культурнае жыццё ў перыяд беларусізацыі. Стварэнне Інбелкульта і яго дзейнасць. Беларуская навука ў 1920-я гг., развіццё літаратуры. Творчыя аб’яднанні «Маладняк» і «Узвышша». Станаўленне беларускага тэатра. Вандроўны тэатр У. Галубка. Выяўленчае і музычнае мастацтва. Барацьба з рэлігіяй і ўзмацненне ідэалагічнага ціску ў культурным жыцці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 49. Індустрыялізацыя і калектывізацыя ў БССР*

Гістарычная неабходнасць індустрыялізацыі краіны. Розныя падыходы да гэтай праблемы. Зацвярджэнне сталінскай мадэлі будаўніцтва сацыялізму. Рашэнні XIV з'езда УКП(б) – з'езда індустрыялізацыі (1925). Першыя новабудоўлі ў БССР.

Прыняцце першага пяцігадовага плана развіцця народнай гаспадаркі і яго карэкціроўкі. Крыніцы назапашвання сродкаў для ажыццяўлення савецкага варыянта індустрыялізацыі ў БССР. Сацыяльная палітыка дзяржавы. Вынікі першай пяцігодкі і прыняцце другога пяцігадовага плана і мерапрыемствы па яго выкананні. Новабудоўлі пяцігодак. Суадносіны планавання і рэальных паказчыкаў. Усталяванне рэпрэсіўных метадаў кіравання эканомікай і спалучэнне іх з працоўным энтузіязмам. Стаханаўскі рух. Ударніцтва. Сацыялістычнае спаборніцтва. Вынікі першых пяцігодак.

Гістарычная заканамернасць рэфармавання сельскай гаспадаркі. Неабходнасць стварэння буйных гаспадарак. Калектывізацыя – савецкі варыянт дасягнення гэтай мэты. Рашэнні XV з'езда УКП(б) – з'езда калектывізацыі (1927). Хлебанарыхтоўчы крызіс і пераход да фарсіраванай калектывізацыі. Дырэктыўныя і рэпрэсіўныя метады правядзення калектывізацыі. Вызначэнне тэмпаў. «Вялікі пералом» 1929 г. «Прышчэпаўшчына» і «раскулачванне» сераднякоў. Супраціўленне сялянства прымусовай калектывізацыі. Артыкул І. В. Сталіна «Галавакружэнне ад поспехаў» і яго наступствы. Масавы выхад з калгасаў. Голад у Беларусі. Новая хваля суцэльнай калектывізацыі. Завяршэнне калектывізацыі і яе вынікі.

### *Тэма 50. Грамадска-палітычная сітуацыя і культурнае жыццё ў БССР у 1930-я гг.*

Прычыны ўсталявання таталітарнай сістэмы і культу асобы І. В. Сталіна. Ідэалагічнае абгрунтаванне рэпрэсіўнай палітыкі. Справы аб «Саюзе вызвалення Беларусі», «Беларускім нацыянальным цэнтры». Ліквідацыя беларускіх нацыянальных кадраў. Рэарганізацыя дзейнасці судовых органаў. Хваля рэпрэсій 1937–1938 гг. БССР і знішчэнне апанентаў І. В. Сталіна. Прыняцце Канстытуцыі 1937 г., механізм правядзення выбараў і фарміравання дзяржапарату. Рэпрэсіі ў БССР у адносінах да партыйнага кіраўніцтва і нацыянальнай інтэлігенцыі. Рэпрэсіі ў арміі. Канчатковае ўсталяванне таталітарнай сістэмы, яе асаб-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лівасці і сацыяльна-псіхалагічная аснова. Агульныя лічбы рэпрэсій, разгляд праблемы ў айчыннай гістарыяграфіі.

Далейшае разгортванне культурнай рэвалюцыі, барацьба з непісьменнасцю, падрыхтоўка савецкай інтэлігенцыі. Згортванне беларусізацыі і прычыны гэтага. Рэарганізацыя вышэйшай школы. Развіццё беларускай навукі і ўплыў на яе палітычных рэпрэсій. Дэнацыяналізацыя, рэформа беларускага правапісу, абмежаванне ўжытку беларускай мовы. Творчасць Я. Коласа, Я. Купалы, К. Крапівы, П. Глебкі і інш. Рэпрэсіі ў галіне літаратуры (А. Бабарэка, М. Гарэцкі, І. Дубоўка, Я. Дыла, С. Астрэйка, М. Лужанін і інш.). Уплыў масавых рэпрэсій на развіццё беларускай нацыянальнай культуры.

Развіццё беларускага тэатра. Музычнае і выяўленчае мастацтва. Архітэктура і будаўніцтва. Станаўленне беларускага кіно. Палітычная накіраванасць культурна-асветніцкіх арганізацый. Палітыка дзяржавы ў адносінах да рэлігіі.

### *Тэма 51. Сацыяльна-эканамічны стан Заходняй Беларусі*

Умовы Рыжскага міру і рэальная палітыка польскіх улад у Заходняй Беларусі. Адміністрацыйны падзел. Вяртанне бежанцаў.

Узровень эканамічнага развіцця Заходняй Беларусі на момант заключэння Рыжскага міру. Эканамічная палітыка польскага ўрада. Прамысловае развіццё ў беларускіх ваяводствах, іх месца ў эканоміцы Польшчы. Знішчэнне прыродных рэсурсаў краю. Цыклічнасць развіцця. Падатковая і фінансавая палітыка ўрада. Крызіс 1929–1933 гг. і яго праяўленне ў Заходняй Беларусі. Сацыяльныя адносіны. Становішча рабочых. Забастоўкі. Беспрацоўе. Масавая эміграцыя. Асноўныя прычыны заняпаду прамысловасці Заходняй Беларусі.

Сітуацыя ў сельскай гаспадарцы. Памешчыцкае і сялянскае землеўладанне. Працэс камасацыі. Прыняцце законаў аб парцэляцыі і асадніцтве. Развіццё заканадаўчай базы ў 1930-я гг. у галіне сельскай гаспадаркі. Праблема сервітутаў і яе «ліквідацыя». Насаджэнне асадніцтва. Становішча сялян. Нарачанскае паўстанне рыбакоў. Сялянскія выступленні. Прычыны хранічнага застою сельскай гаспадаркі.

### *Тэма 52. Грамадска-палітычнае жыццё і нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі*

Гарантыі развіцця нацыянальных меншасцей у Польшчы згодна ўмоў Рыжскага міру 1921 г. і Канстытуцыі Польшчы



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1921 г. Фальсіфікацыя нацыянальнага складу насельніцтва Заходняй Беларусі. Абмежаванне нацыянальных правоў беларускага насельніцтва. Закрыццё беларускіх школ, настаўніцкіх семінарый, абмежаванне друку. Палітыка паланізацыі.

Паланізацыя мясцовых уладных структур і органаў самакіравання – сельскага, гарадскога, павятовага. Дзяржаўны пераварот Ю. Пілсудскага ў маі 1926 г.

Тактыка нацыянальных дзеячаў Заходняй Беларусі па абароне правоў беларускага насельніцтва. Удзел у выбарах рознага ўзроўню. Беларускае парламенцкае прадстаўніцтва ў 1922–1925 гг. Беларускі пасольскі клуб (БПК). Стварэнне Беларускай сялянска-работніцкай грамады (БСРГ), яе праграма і дзейнасць. Б. Тарашкевіч. Разгром БСРГ у 1927 г. Парламенцкія аб'яднанні беларускіх паслоў і сенатараў у 1928–1930 гг., Беларускі пасольскі клуб «Змаганне за інтарэсы сялян і работнікаў» і яго дзейнасць. Разгром клуба «Змаганне». Выбары ў парламент і раскол беларускага нацыянальнага руху.

Утварэнне Кампартыі Заходняй Беларусі (КПЗБ) і Камуністычнага саюза моладзі Заходняй Беларусі (КСМЗБ). Узаемадзеянне з партыйнымі органамі БССР. Арганізацыя партызанскай барацьбы ў Заходняй Беларусі ў 1924–1925 гг. Пераход ад падпольнай да легальнай дзейнасці. Рэпрэсіі польскага ўрада. С. Прытыцкі. Канцлагер Бяроза-Картузская.

Культура Заходняй Беларусі. Развіццё літаратуры. М. Танк, В. Таўлай, Ф. Аляхновіч, П. Пястрак. Выяўленчае мастацтва. П. Сергіевіч, Ф. Рушчыц, Я.Драздовіч. Таварыства беларускай школы (ТБШ) і яго дзеячы. І. Дварчанін. Р. Шырма. Закрыццё ТБШ польскімі ўладамі. Дзейнасць Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры (1926–1936). Канфесіянальная палітыка ўрада Польшчы.

### *Тэма 53. Першы перыяд Другой сусветнай вайны. Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР*

Прыкметы абвастрэння міжнародных адносін у 1938–1939 гг. Савецка-германскі дагавор ад 23 жніўня 1939 г. і сакрэтны пратакол да яго. Знешнепалітычная арыентацыя Польшчы. Нападзенне фашысцкай Германіі на Польшчу. Удзел насельніцтва заходнебеларускіх ваяводстваў у ваенных дзеяннях. Скрытая і ўсеагульная мабілізацыя. Пераход Чырвонай арміяй савецка-польскай мяжы 17 верасня 1939 г. і ваенныя дзеянні на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэрыторыі Заходняй Беларусі. Савецка-германскі дагавор ад 28 верасня 1939 г. і дадатковыя сакрэтныя протаколы.

Адносіны насельніцтва да вераснёўскіх падзей. Арганізацыя часовых органаў кіравання ў Заходняй Беларусі і іх дзейнасць. Выбары ў Народны сход, яго правядзенне і рашэнні. Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР. Сучасная ацэнка гэтай падзеі.

Дзейнасць новастворaных органаў савецкай улады ў Заходняй Беларусі. Сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні. Працоўны энтузіязм. Першыя калгасы. Станаўленне культурна-асветных устаноў і кірункі іх дзейнасці.

Вынікі сацыяльнага і эканамічнага жыцця БССР у першыя гады трэцяй пяцігодкі (1939–1941). Узмацненне кантролю за працоўнай дысцыплінай. Пераўзбраенне войскаў Заходняй асобай ваеннай акругі. Пачатак умацавання заходняй мяжы СССР. Перадача буржуазнай Літве ўрадам СССР Вільні і Віленскай вобласці, а ўрадам БССР – пагранічных тэрыторый.

***Тэма 54. БССР у гады Вялікай Айчыннай вайны (1941–1944)***

Мерапрыемствы савецкай улады ў галіне эканомікі, грамадска-палітычнага жыцця краіны напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны. Сітуацыя ва ўзброеных сілах СССР. Савецкая ваенная дактрына. Прычыны вайны.

План «Барбароса». Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Суадносіны сіл СССР і Германіі. Пагранічныя баі Чырвонай арміі. Абарона Брэсцкай крэпасці. Супраціўленне войск Заходняй Асобай ваеннай акругі ў жніўні 1941 г. Першыя паветраныя тараны савецкіх лётчыкаў. Баі 26–28 жніўня пад Мінскам. Адступленне Чырвонай арміі. Баі пад Барысавам, Магілёвам, Оршай. Першыя контрудары Чырвонай арміі пад Жлобінам і Рагачовам. Выхад армейскіх падраздзяленняў з акружэння. Трагедыя ваеннапалонных.

Першыя мерапрыемствы беларускага ўрада па перабудове жыцця на ваенны лад. Мабілізацыя. Складанасці эвакуацыі. Лёс Заходняй Асобай ваеннай акругі і яе камандавання. Прычыны паражэнняў Чырвонай арміі ў пачатковы перыяд вайны.

Акупацыя Беларусі і ўстанаўленне акупацыйнага рэжыму. Сутнасць плана «ОСТ». Адміністрацыйнае кіраванне на акупаваных тэрыторыях. Эканамічныя мерапрыемствы і аграрная палітыка германскіх улад. Знішчэнне і вываз культурных каштоўнасцей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Стасункі паміж акупацыйнымі ўладамі і беларускімі нацыянальнымі ўтварэннямі. Іх сучасная ацэнка.

Арганізацыя партызанскага і падпольнага руху на акупаванай тэрыторыі. Першыя партызанскія і падпольныя фарміраванні. Мэты, формы і змест дзейнасці партызан і падпольшчыкаў. Стварэнне ЦШПР і БШПР. Мінскае падполле, яго дзейнасць. Стварэнне партызанскіх зон і партызанскіх краёў. Баявыя аперацыі партызан. Рэйкавая вайна, яе этапы і вынікі. Каардынацыя дзейнасці партызан і Чырвонай арміі. Карныя аперацыі акупантаў. Гераізм удзельнікаў партызанскага і падпольнага руху.

Пачатак вызвалення Беларусі восенню 1943 г. Першыя аднаўленчыя мерапрыемствы на вызваленай тэрыторыі. Аперацыя «Баграціён», стратэгічныя і тактычныя сродкі яе ажыццяўлення. Новае ў ваеннай дактрыне. Акружэнне нямецкіх войск пад Віцебскам, Бабруйскам, Мінскам. Польскі рух супраціўлення ў Заходняй Беларусі. Прычыны супярэчнасцей паміж Арміяй Краёвай і савецкім камандаваннем. Вызваленне тэрыторыі Беларусі ад нямецка-фашысцкіх войскаў.

### *Тэма 55. БССР у перыяд аднаўлення 1945–1950 гг.*

Матэрыяльныя і людскія страты БССР падчас вайны. Аднаўленчыя работы ў 1944–1945 гг. ва ўмовах прадаўжэння вайны. Кадравы «голад». Уступленне ў строй першых прадпрыемстваў і іх галоўны дэвіз – «Усё для фронту». Аднаўленне чыгункі. Апора на працоўны энтузіязм, даваенныя формы і метады арганізацыі працы.

Перавод эканомікі на мірныя рэйкі пасля заканчэння вайны. Галоўныя кірункі развіцця згодна планаў чацвёртай пяцігодкі (1946–1950). Яе асаблівасці ў БССР. Уздым эканомікі заходніх абласцей. Дапамога народаў СССР у адраджэнні эканомікі рэспублікі. Іншыя крыніцы аднаўлення.

Разгортванне працэсу аднаўлення на новым тэхналагічным і навукова-тэхнічным узроўні: стварэнне новых галін вытворчасці, укараненне новых тэхналогій, забеспячэнне высокаадукаванымі кадрамі і г. д. Дасягненні ў развіцці прамысловасці. Становішча ў сельскай гаспадарцы. Аднаўленне калгасаў, іх узбуйненне. Калектывізацыя ў заходніх абласцях БССР. Вынікі аднаўлення сельскай гаспадаркі. Развіццё сацыяльнай сферы. Сацыяльная абарона дзяцей-сірот, адраджэнне дабрачыннага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

руху. Картачная сістэма і яе адмена. Прымусовыя пазыкі. Грашовая рэформа. Грамадска-палітычнае жыццё. Партыйныя і камсамольскія органы. Саветы і вяртанне да метадаў адміністрацыйна-каманднай сістэмы. Рэпрэсіі супраць касмапалітаў і беларускай інтэлігенцыі.

Змены ў міжнародным статусе БССР. Удзел беларускай дэлегацыі ў падпісанні Устава ААН. Пашырэнне міжнароднай дзейнасці БССР.

Аднаўленне працы школ, тэхнікумаў, вузаў, навукова-даследчых інстытутаў, культурных устаноў. Пераход на ўсеагульнае абавязковае сямігадовае навучанне. Развіццё літаратуры (Я. Колас, М. Танк, І. Шамякін), драматургіі (К. Крапіва, А. Маўзон), музыкі (В. Залатароў, М.Аладаў,) тэатра (П. Глебаў, Л. Александроўская, У.Дзядзюшка), выяўленчага мастацтва (В. Волкаў, І. Зайцаў), скульптуры (З. Азгур, А. Бембель). Архітэктурныя планы аднаўлення Мінска і другіх гарадоў рэспублікі.

### *Тэма 56. БССР у 1950–1960-я гг.*

Перамены ў грамадска-палітычным жыцці рэспублікі пасля смерці І. В. Сталіна. Выкрыццё культу яго асобы. Спробы дэмакратызацыі грамадскага жыцця. Рэабілітацыя ахвяр палітычных рэпрэсій.

Дзейнасць К. Т. Мазурава на пасадзе Першага сакратара ЦК КП(б)Б (1956–1965).

Развіццё прамысловасці. Праявы навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. З’яўленне новых галін вытворчасці, укараненне новай тэхнікі і тэхналогій. Саўнаргасы. Уплыў рэформ па кіраванні эканомікай на яе развіццё. Прычыны прыняцця сямігадовага плана (1959–1965). Эканамічная рэформа 1965 г. і яе сутнасць. Вынікі 8-й пяцігодкі (1966–1970).

Становішча сельскай гаспадаркі ў 1950-я гг. Меры па яе ўздыме. Рэарганізацыя МТС. Удзел беларускай моладзі ў асваенні цэліны. Крызісныя з’явы ў сельскай гаспадарцы. Эканамічная рэформа ў сельскагаспадарчай вытворчасці 1965 г. Меліярацыя. Паглыбленне спецыялізацыі і канцэнтрацыі сельскагаспадарчай вытворчасці. Стварэнне аграрна-прамысловых комплексаў (АПК).

Змены ў сацыяльнай структуры грамадства. Пашпартызацыя вёскі. Увядзенне пенсійнага забеспячэння калгаснікаў. Жыл-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

лёвае будаўніцтва. Развіццё сацыяльнай сферы, бытавога абслугоўвання насельніцтва. Увядзенне політэхнічнага і працоўнага навучання. Васьмігодкі. Адзінаццацігадовыя школы з працоўным навучаннем.

### *Тэма 57. БССР у 1970–1980-я гг.*

Прадаўжэнне дэкларавання партыйным кіраўніцтвам лініі на ўздым матэрыяльна-тэхнічнага і культурнага ўзроўню жыцця насельніцтва. Партыйна-гаспадарчая наменклатура. П. М. Машэраў – Першы сакратар ЦК КП(б)Б у 1965–1980 гг.

Будаўніцтва навукаёмкіх прадпрыемстваў. Прамысловы комплекс Беларусі – зборачны цэх СССР. Развіццё ўсіх відаў транспарту. Нізкія тэмпы развіцця лёгкай і харчовай прамысловасці. Пагаршэнне экалагічнай сітуацыі. Крызісныя з'явы ў эканоміцы. Паняцце «застой».

Далейшая спецыялізацыя і канцэнтрацыя сельскагаспадарчай вытворчасці. Стварэнне Дзяржаграпрома. Пашырэнне саўгаснай формы гаспадарання. «Неперспектыўныя» вёскі. Абвастрэнне харчовай праблемы. Запаруджванне тэмпаў сельскагаспадарчага развіцця і прычыны гэтага.

Пашырэнне тэарэтычных высноў аб сціранні моўных асаблівасцей пры фарміраванні адзінай савецкай нацыі на практычную сферу ўжывання нацыянальнай мовы – адукацыю, літаратуру, друк, культуру. Негатыўныя наступствы гэтага асіміляцыйнага працэсу.

Новыя рэформы ў школьнай адукацыі. Пераход да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі моладзі. Рост устаноў сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі.

Развіццё беларускай літаратуры. Лаўрэаты Ленінскіх прэмій – П. Броўка, І. Мележ, М. Танк. Увядзенне літаратурных прэмій імя Я. Купалы і імя Я. Коласа. З'яўленне новых талентаў – Р. Барадулін, Н. Гілевіч, У. Караткевіч, В. Быкаў і інш. Беларуская драматургія – А. Дудараў, А. Петрашкевіч. Музычнае мастацтва – «Песняры», «Сябры», «Купалінка» і інш. Выяўленчае мастацтва – М. Савіцкі, Л. Шчамялёў, М. Данцыг і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 3.2 Рэспубліка Беларусь у сучасным геапалітычным працэсе

### *Тэма 58. Рэспубліка Беларусь: этапы станаўлення*

Гістарычная заканамернасць пераходу да палітычнай і сацыяльна-эканамічнай перабудовы. Аслабленне цэнтралізаванай сістэмы кіравання эканомікай. Пераход на гаспадарчы разлік і да рыначных адносін. Катастрофа на Чарнобыльскай АЭС і яе наступствы для Беларусі.

Паглыбленне крызісу ў канцы 1980-х гг. – разбалансаванасць спажывецкага рынку, фінансавай сістэмы, інфляцыя, рост цэн і інш. Рост сацыяльнай напружанасці.

Спробы захаваць кіруючую ролю КПСС у дзяржаве, абвяшчэнне дэмакратызацыі грамадскага жыцця і галоснасці. Фарміраванне шматпартыйнасці і палітычнай апазіцыі. З’яўленне нефармальных культурна-асветніцкіх арганізацый. БНФ. Актывізацыя насельніцтва. «Мітынгавая дэмакратыя» вясны 1991 г.

Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі (27 ліпеня 1990 г.). Прыняцце Вярхоўным Саветам БССР законаў аб мовах, аб культуры. Крызіс СССР. Рэферэндум аб захаванні СССР і яго вынікі. Праект падпісання новага саюзнага дагавора. Жнівеньскі путч 1991 г. і яго наступствы. Наданне канстытуцыйнага статусу Дэкларацыі аб суверэнітэце Беларусі (25 жніўня 1991 г.). Спыненне дзейнасці КПБ. Выбары новага кіраўніцтва Беларусі, змена назвы рэспублікі, прыняцце новай сімволікі і закона аб грамадзянстве. Белавежскія пагадненні. Скасаванне СССР і стварэнне СНД. Ацэнкі прычын і наступстваў распаду СССР у гістарычнай літаратуры.

Асаблівасці развіцця Рэспублікі Беларусь у першыя постсавецкія гады. Міжнароднае становішча і дыпламатычнае прызнанне Рэспублікі Беларусь. Сістэмны крызіс постсавецкай прасторы. Дзейнасць урада Беларусі ў галіне скарачэння ўзбраенняў. Унутрыпалітычнае развіццё. Станаўленне шматпартыйнасці, асноўныя палітычныя партыі і іх праграмы. Узрастанне сацыяльна-эканамічнай напружанасці ў 1993–1994 гг. Прыняцце Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь прэзідэнцкай формы кіравання. Канстытуцыя 15 сакавіка 1994 г., першыя прэзідэнцкія выбары 1994 г. Рэферэндумы ў маі 1995 г., лістападзе 1996 г. і кастрычніку 2004 г. Прэзідэнцкія выбары ў 2006 г. і ў наступныя тэрміны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 59. Рэспубліка Беларусь: эканамічнае і сацыяльна-культурнае развіццё. Знешняя палітыка*

Спробы спыніць эканамічны спад і абараніць спажывецкі рынак у пачатку 1990-х гг. Прыватызацыя жылля. Увядзенне нацыянальных разліковых білетаў. Сацыяльная абарона насельніцтва. Прыняцце праграмы пераходу да рынку (1990). Знешняя палітыка і гандаль.

Эканамічны крызіс 1991–1995 гг., яго адмоўныя і станоўчыя вынікі. Распрацоўка асноўных напрамкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 1996–2000 гг. Іх галоўныя мэты і прыярытэтныя кірункі. Адмова ад шокавай тэрапіі. Сацыяльна-арыентаваная эканоміка. Вострыя праблемы эканомікі: неэфектыўнасць сельскай гаспадаркі, затратнасць значнай часткі прамысловых прадпрыемстваў, інфляцыя, нізкая зарплата, перавага імпарту.

Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2001–2005 гг. Яе асноўныя прыярытэты. Зніжэнне ўзроўню інфляцыі. Жыллёвае будаўніцтва. Адзіная эканамічная прастора з краінамі СНД. Паступовае скарачэнне адмоўнага гандлёвага сальда. Праблема інвестыцый. Вынікі выканання праграмы. Далейшыя шляхі эканамічнага развіцця – спецыялізацыя па выпуску канчатковага прадукту, пастаяннае развіццё інфраструктуры (транспартнай, абслугоўваючай, транзітнай), павелічэнне экспарту, пашырэнне інвестыцый, навукаёмкіх тэхналогій і інш.

Стан сельскай гаспадаркі ў канцы 1980 – пачатку 1990 гг. Пошук рынaчных механізмаў гаспадарання ў аграрным сектары. Крызіс 1991–1995 гг. Дыспарытэт цэн паміж прадукцыяй прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Пераход у другой палове 1990-х гг. да буйнатаварнай сельскагаспадарчай вытворчасці. Лізінг і крэдытаванне, пашырэнне дзяржаўнай падтрымкі аграрнага сектара. Праграма ўдасканалення аграпрамысловага комплексу і яе мэта: дасягненне нацыянальнай харчовай бяспекі. Дзяржаўная праграма адраджэння і развіцця вёскі. Пашырэнне ролі аграрнай навукі. Новыя тэхналогіі. Паступовая арганізацыя сацыяльнай структуры ў вёсцы. Аграгарадкі. Разнастайныя формы гаспадарання.

Міжнароднае прызнанне Рэспублікі Беларусь. Прыярытэты знешнепалітычнага курса Рэспублікі Беларусь. Беларусь у СНД. Мытны саюз. Адзіная эканамічная прастора. Шматвектарнасць знешняй палітыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Тэма 60. Новыя тэндэнцыі і формы арганізацыі культурнага жыцця краіны на сучасным этапе*

Уплыў сучаснай сацыякультурнай сітуацыі на стан і змест культурнага развіцця. Разнастайнасць форм арганізацыі вольнага часу ў сучасны перыяд. Узаемадзеянне аб'ектаў сацыякультурнай сферы (музеяў, бібліятэк, дамоў культуры і г.д.). Адраджэнне традыцыйных форм правядзення дасугу. Дамы народнай творчасці і іх дзейнасць. Арганізаваная аматарская творчасць. Сучасныя формы: антыкафэ, адраджэнне бальнай традыцыі, маладзёжныя фестывалі, новыя тэатральныя формы. Буккросінг, мабільныя электронныя бібліятэкі.

Дабрачыннасць. Адраджэнне рэлігійна-канфесіянальнага жыцця. Дзяржаўна-прыватнае супрацоўніцтва. Стан гісторыка-культурнай спадчыны. Спонсарства. Выяўленчае мастацтва Беларусі. Новыя тэатральныя формы. Беларускае кінамастацтва. Культурны і спартыўны турызм як адна з форм правядзення дасугу. Новыя тэндэнцыі ў галіне адукацыі. Узрастанне колькасці ўстаноў вышэйшай адукацыі. Сістэма бесперапыннай адукацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

***1. Падручнікі і вучэбныя дапаможнікі***


*1. Бригадин, П. И.* История Беларуси в контексте европейской цивилизации : курс лекций / П. И. Бригадин. – Минск : ГИУСТ БГУ, 2007. – 336 с.

*2.* Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны) / А. А. Каваленя, У. І. Лемяшонак [і інш.] ; пад рэд. А. А. Кавалені, М. С. Сташкевіча. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2004. – 279 с.

*3.* Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветных цывілізацый : вучэб. дапам. / В. І. Галубовіч [і інш.] ; пад рэд. В. І. Галубовіча, Ю. М. Бохана. – Мінск : Экаперспектыва, 2007. – 334 с.

*4.* Гісторыя Беларусі: курс лекцый : у 2 ч. / П. У. Брыгадзін [і інш.]. – Мінск : РІВШ БДУ, 2002. – 2 ч.

*5.* Гісторыя Беларусі. Ад старажытных часоў – па 2008 г. : вучэб. дапам. / Я. К. Новік, У. Л. Качалаў, Н. Я. Новік; пад рэд. Я. К. Новіка. – Мінск : Выш. шк., 2009. – 512 с.

*6.* Гісторыя Беларусі : курс лекцый : у 2 ч. / пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. – Мінск : Універсітэцкае, 2000, 2002.

*7.* Гісторыя Беларусі: у 6 т. / Ю. Бохан [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2000–2006. – 6 т.

*8. Довнар-Запольский, М. В.* История Белоруссии / М. В. Довнар-Запольский. – Минск : Беларусь, 2003. – 274 с.

*9. Ермаловіч, М. І.* Старажытная Беларусь / М. І. Ермаловіч. – Мінск : Мастац. літ., 2001. – 366 с.

*10. Коваленя, А. А.* Беларусь 1939–1945. Война и политика / А. А. Коваленя. – Минск : Веды, 2001. – 204 с.

*11. Ковкель, И. И.* История Беларуси с древнейших времен до нашего времени / И. И. Ковкель, Э. С. Ярмусик. – Минск : Аверсэв, 2006. – 604 с.

*12. Лыч, Л.* Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – Мінск : Экаперспектыва, 1996. – 453 с.

*13.* Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / М. П. Касцюк [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 1994. – Ч. 1. – 527 с.

*14.* Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / М. П. Касцюк [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 1995. – Ч. 2. – 560 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*15. Сагановіч, Г. М.* Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII стагоддзя / Г. М. Сагановіч. – Мінск: Энцыклапедыкс, 2001. – 412 с.

### *2. Дакументы і матэрыялы*

*1.* Беларусізацыя: 1920-я гады: дакументы і матэрыялы / пад рэд. Р. П. Платонава, У. І. Коршука. – Мінск : БДУ, 2001. – 284 с.

*2.* Беларусь и война 1812 года: документы / сост.: А. М. Лукашевич, Д. Л. Яцкевич. – 2-е изд. – Минск : Беларусь, 2013. – 559 с.

*3.* Белоруссия в эпоху феодализма: сб. документов и материалов : в 4 т. / сост.: З. Ю. Копысский, М. Ф. Залога. – Минск : Наука и техника, 1959–1979. – 4 т.

*4.* Белоруссия в эпоху капитализма: сб. документов и материалов: в 3 т. / сост.: В. И. Мелешко [и др.]. – Минск : Наука и техника, 1983–1990. – 3 т.

*5.* Белорусские остарбайтеры: документы и материалы: в 3 кн. / сост. Г. Д. Кнатько ; редкол.: В. И. Адамушко [и др.]. – Минск : НАРБ, 1996–1998. – 3 кн.

*6. Бережков, Н. Г.* Литовская Метрика как исторический источник / Н. Г. Бережков. – М. ; Л. : Изд-во АН СССР, 1946. – 179 с.

*7.* Восстание в Литве и Белоруссии 1863–1864 гг. / редкол.: В. Дьяков [и др.]. – Вроцлав ; М. : Наука, 1965. – 587 с.

*8.* Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны: документы и материалы : в 3 т. / сост.: З. И. Белуга [и др.]. – Минск : Беларусь, 1967–1982. – 3 т.

*9.* Документы по истории Беларуси в «Особой папке» И. В. Сталина / сост. С. В. Жумарь [и др.]. – Минск : НАРБ, 2004. – 84 с.

*10.* Индустриализация Белорусской ССР (1926–1941) : сб. документов и материалов / сост. В. Н. Жигалов [и др.]. – Минск : Беларусь, 1975. – 467 с.

*11. Калиновский, К.* Из печатного и рукописного наследия / К. Калиновский. – Минск : Беларусь, 1988. – 208 с.

*12.* Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. – Мінск : Беларусь, 2006. – 92 с.

*13.* Нямецка-фашысцкі генацыд на Беларусі (1941–1944) / пад рэд. У. М. Міхнюка. – Мінск : БелНДЦДААС, 1995. – 416 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*14.* Освобожденная Беларусь: документы и материалы: в 2 кн. / Комитет по архивам и делопроизводству. – Минск : НАРБ, 2004–2005.

*15.* Уния в документах : сб. / сост.: В. А. Теплова, З. И. Зуева. – Минск : Лучи Софии, 1997. – 518 с.

*16.* Хрестоматия по истории БССР. 1917–1983 / сост.: А. П. Игнатенко [и др.]. – Минск : Университетское, 1984. – 453 с.

*Дадатковая*

*1. Анішчанка, Я. К.* Беларусь у часы Кацярыны II (1771–1996) / Я. К. Анішчанка; пад рэд. У. А. Сосна. – Мінск : Веды, 1998. – 220 с.

*2. Арлоў, У. А.* Таямніцы полацкай гісторыі / У. А. Арлоў. – Мінск : Полымя, 2000. – 463 с.

*3.* Беларусь. 1941–1945: Подвиг. Трагедия. Память : в 2 кн. / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории ; редкол.: А. А. Коваленя [и др.]. – Минск : Белорус. наука, 2010.

*4. Бохан, Ю.* Побыт феадалаў Вялікага княства Літоўскага ў XV – сярэдзіне XVII ст. / Ю. Бохан, А. Скел'ян. – Мінск : Беларусь, 2011. – 271 с.

*5. Блинова, Т. Б.* Иезуиты в Белоруссии / Т. Б. Блинова. – Минск : Беларусь, 1990. – 190 с.

*6. Бяспалая, М. А.* Сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё беларускай вёскі ў гады нэпа (1921–1927) / М. А. Бяспалая. – Мінск : БДУКМ, 2009. – 345 с.

*7. Вайтовіч, Н. Г.* Баркулабаўскі летапіс / Н. Г. Вайтовіч. – Мінск : Беларусь, 1977. – 205 с.

*8. Грицкевич, А. П.* Западный фронт РСФСР, 1918–1920. Борьба между Россией и Польшей за Белоруссию / науч. ред. А. Е. Тараса. – Минск : Харвест, 2010. – 496 с.

*9. Грыцкевіч, Анатоль.* Старонкі нашай мінуўшчыны / Анатоль Грыцкевіч. – Мінск : Кнігазбор, 2009. – 468 с.

*10. Дзмітрачкоў, П. Ф.* Беларусь у складзе Вялікага княства Літоўскага. Другая палова XIII – першая палова XVII ст. / П. Ф. Дзмітрачкоў. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2003. – 312 с.

*11. Иоффе, Э. Г.* Белорусские евреи: трагедия и героизм: 1941–1945 / Э. Г. Иоффе. – Минск : Асар, 2003. – 428 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*12 Иоффе, Э. Г.* Страницы истории евреев Беларуси / Э. Г. Иоффе. – Минск : Беларусь, 1996. – 292 с.

*13. Казлоў, Л. Р.* Беларусь на сямі рубяжах / Л. Р. Казлоў, А. К. Цітоў. – Мінск : БДУ, 1993. – 71 с.

*14. Кузьменко, В. И.* Интеллигенция Беларуси в период немецко-фашистской оккупации (1941–1944 гг.) // В. И. Кузьменко. – Минск : Амалфея, 2001. – 199 с.

*15. Ладысеў, У. Ф.* На пераломе эпох. Станаўленне беларускай дзяржаўнасці (1917–1920) / П. І. Брыгадзін, У. Ф. Ладысеў. – Мінск : БДУ, 1999. – 128 с.

*16. Літвін, А. М.* Акупацыя Беларусі (1941–1944): пытанні супраціву і калабарацыі / А. М. Літвін. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2000. – 288 с.

*17. Мальдзіс, А.* На скрыжаванні славянскіх традыцый / А. Мальдзіс. – Мінск : Беларусь, 1980. – 352 с.

*18. Самусік, А. Ф.* Помнікі гісторыі і культуры Беларусі : вучэб. дапам. / А. Ф. Самусік. – Мінск : БДЭУ, 2001. – 209 с.

*19. Туронак, Ю.* Мадэрная гісторыя Беларусі / Ю. Туронак. – Вільня : Ін-т беларусістыкі, 2006. – 877 с.

*20. Трусаў, А. А.* Беларускае кафлярства / А. А. Трусаў. – Мінск : Беларус. ін-т праблем культуры, 1993. – 55 с.

*21. Трусаў, А. А.* Манументальнае дойлідства Беларусі XI–XVIII стст. / А. А. Трусаў. – Мінск : Лекцыя, 2001. – 203 с.

*22. Улашчык, М. М.* Выбранае / М. М. Улашчык. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2001. – 604 с.

## Пералік сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

– залік;
– экзамен;
– курсавая работа.

*Арганізацыя* самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае падрыхтоўку студэнтамі інфармацыйных матэрыялаў па вывучэнні гісторыі свайго краю і аналіз увасаблення яе ў музейнай экспазіцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай*
*спадчыны (па напрамках)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2015. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 2,91. Ул.-выд. арк. 2,29. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.